№ 16 (518) 4 траўня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

У НУМАРЫ

**«Чарнобыльскі шлях»**

сабраў тысячы маніфэстантаў. Абсалютную большасьць іх складала моладзь. **Старонка 8.**

**Голас нацыі**

Рэакцыі чытачоў на артыкул Сяргея Богдана «Перазагрузка Беларусі» аналізуе аўтар. **Старонка 22.**

## Падзеі ў Эстоніі і вакол Эстоніі

Перанос помніку савецкім салдатам выклікаў беспарадкі ў Таліне і ўсплёск шавінізму ў Расеі.

Начная бітва за гісторыю — **старонка 3**. «Падобна мусульманам у Заходняй Эўропе, расейскамоўныя жыхары Балтыі ня хочуць ці ня могуць інтэгравацца ў грамадзтва, арыентаванае на эўрапейскія каштоўнасьці». Піша Віталь Тарас. **Старонка 4.** «Што было б, каб па вуліцах Масквы хадзіў натоўп, рабаваў крамы і скандаваў: «Эстонія, Эстонія!»? Піша Руслан Равяка. **Старонка 6.**

# Тут будзе саўна і боўлінг

Фотарэпартаж **Алеся Матафонава** і **Сяргея Харэўскага** з кляштару бэрнардынаў. **Старонка 16.**



АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

# У нумары

## люстра дзён

Пераўзыходзячы чаканьні ................ 8
40 км на ровары, каб трапіць на «Чарнобыльскі шлях» ................ 12
Халодны Першамай ........................ 13
Бруд на адрас жонкі Мілінкевіча . 14
Лукашэнка не даруе антысавеччыкам ................................ 14
Набор у беларускамоўныя гімназіі пад пагрозай ........................ 14
Канал TV Belarus афіцыйна зацьверджаны .................................... 15
Судзьдзя Таманаў адмовіўся весьці справу маладафронтаўцаў . 15
Хроніка апазыцыі ............................ 15
Парфяновіч і Скрабец заклікалі да ўваходжаньня Беларусі ў Расею .. 21
Уладзімер Парфяновіч: «Нашу ідэю падтрымліваюць ва ўрадзе» 21

## камэнтары

Віталь Тарас. Ледавіковы пэрыяд . 4

## культура

Кніга пра беларускую разгубленасьць .................................. 20

## рэакцыі

Голас нацыі ......................................... 22
Руслан Равяка. Перазахаваньне ...... 6
Аляксандар Класкоўскі. «Усе свае, зіг хайль!» ....................... 7

## музыка

«Палац» стаіць трывала ................. 30

## дзе варта быць

Выцінанкі Юр'я Малішэўскага, вяртаньне дзеда з жоравам… ....... 31

# Дзякуй

**Андрэю А.**, **Ігару К.**, **Г.К.** зь Менскага раёну.
**М.Б.** з Полацку.
**Марыі Б.** з Баранавіч.
**Івану Г.** са Смалявіч.
**Мікалаю В.** зь Белаазёрску.
**В.Л.** з Гомелю.
**В.Ж.** з Барысава.
**Іне П.** з Пухавіцкага раёну.
**А.К.** з Горадні.
**Андрэю Г.** зь Ліды.
**Вользе П.** з Маладачанскага раёну.
**Сяргею С.** зь Віцебску.
**Яўгену Ш.**, **Генадзю Л.**, **К.Ф.**, **Вользе Л.**, **М.Р.**, **Надзеі І.**, **Уладзімеру П.**, **В.Ц.**, **Віктару В.**, **Анатолю М.**, **Станіславу Б.**, **Сяргею Е.**, **Яўгеньні Я.**, **Тацяне Р.**, **Людміле Ж.**, **Алене Л.**, **Мікалаю Б.**, **Леаніду Л.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3015 212 000 012 | Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3015 212 000 012 | Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пераказваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

# Начная бітва за гісторыю

Расейцы справакавалі крывавыя беспарадкі ў Таліне.

Сутычкі на вуліцах эстонскай сталіцы распачаліся ў чацьвер поначы. Ад ранку эстонскія археолягі прыступілі да эксгумацыі парэшткаў савецкіх салдатаў. Урад вырашыў перанесьці іх разам з помнікам — г.зв. Бронзавым салдатам — з цэнтру гораду на вайсковыя могілкі.

Працы адбываліся пад разгорнутым вялікім вайсковым намётам пад абаронай шчыльнага кардону паліцыянтаў. Увечары да пагорку Тынісьмягі, дзе стаяў помнік, сталі сьцягвацца пратэстоўцы — расейскамоўныя жыхары Таліна. Аўтобусы прыехалі таксама з Нарвы, Кохтла-Ярвэ і Сіламяэ — паўночнага ўсходу краіны.

На зьмярканьні група зь некалькіх дзясяткаў чалавек спрабавала прарваць ачапленьне і прадзерціся да помніку праз паркан. Паліцыя не дала рады іх адціснуць і ўжыла вадамёты і сьвятлашумавыя гранаты.

Натоўп расьцярушыўся па суседніх кварталах, пачаўся пагром. Запалалі аўтамабілі, драўляная хата, усчаліся рабункі крамаў. Паліцыя ня здолела ўтрымаць сытуацыю пад кантролем. Ахоўнікі правапарадку адганялі натоўп ад дзяржаўных установаў, расьсякалі яго на меншыя групы і масава затрымлівалі.

Сутычкі суняліся пад ранак, але аднаўляліся яшчэ дзьве ночы. Усяго за гэтыя тры ночы паліцыя затрымала каля тысячы чалавек.

Вандалы скарысталіся беспарадкамі для марадзёрства, невядомыя скарысталіся марадзёрствам для забойства.

Адзін хлопец пры няясных абставінах загінуў ад нажавога раненьня, некалькі дзясяткаў атрымалі траўмы — пераважна парэзы рук і твару кавалкамі шкла ад вітрынаў.

І асоба, якая загінула, і дзясяткі спасярод затрыманых маюць расейскае грамадзянства, а арганізацыя «Начная варта», якая каардынавала пратэсты каля помніку, дзейнічае з апораю на расейскае пасольства ў Таліне. Гэта дазволіла эстонскамоўным СМІ ўбачыць у падзеях «руку Масквы». Яны зьвяртаюць увагу на правакацыйныя рэпартажы расейскіх тэлеканалаў.

«Іх яднае не нацыянальнасьць і ня погляд на рашэньне пра знос помніку. Іх супольнай і галоўнай мэтай быў рабунак, авантура, злачынства», — заявіў у тэлезвароце да нацыі эстонскі прэзыдэнт Тоомас Хендрык Ільвэс.

Эстонскі ўрад адразу пасьля выбуху актаў вандалізму сабраўся на экстранае паседжаньне. А 2.40 ночы ён прыняў рашэньне пра неадкладны перанос помніку, які выклікаў такія жарсьці. А 5.00 манумэнт быў дэмантаваны і перавезены ў тайнае месца.

— Годзе, годзе, годзе! — крычаў праз пару гадзінаў у Маскве старшыня Рады фэдэрацыі Сяргей Міронаў. Ён заклікаў урад разарваць дыпляматычныя адносіны з Талінам.



BRONZE-SOLDIER.COM

**За тры ночы паліцыя затрымала каля тысячы чалавек.**

Бронзавы салдат стаў яблыкам разладу ў расейска-эстонскай спрэчцы пра гісторыю. Прэм'ер-міністар Эстоніі Андрус Ансіп назваў яго «сымбалем савецкай акупацыі». Для расейскамоўных жа — яны складаюць аж 35% насельніцтва Эстоніі — гэта сымбаль перамогі над нацызмам. «А раз мы вызвалілі эстонцаў ад немцаў, мы маем маральнае права прысутнічаць на гэтай зямлі» — разважаюць яны.

Эстонцы панесьлі ў савецкі час нашмат горшыя страты, чым ад немцаў. У музэі акупацыі ў цэнтры Таліна можна прачытаць, што ад савецкіх рэпрэсій пацярпелі 150 тысяч чалавек, ці амаль кожны шосты жыхар краіны. Партызанская вайна супраць савецкай акупацыі не спынялася да 1952 году.

«У расейцаў кароткая памяць пра савецкія злачынствы», — піша эстонскі публіцыст Хейкі Тан. Паводле эстонскіх падручнікаў гісторыі, акупацыя скончылася толькі ў 1991 годзе, з падзеньнем СССР. Акрамя масавага вывазу эстонцаў у Сібір, расстрэлаў і чыстак інтэлігенцыі, гэты пэрыяд адзначыўся таксама масавымі перасяленьнямі расейцаў і беларусаў у Эстонію, як і ў іншыя балтыйскія краіны.

Для неэстонцаў Бронзавы салдат — гэта ня толькі памятка пра перамогу, але і пра часы, у якія яны былі ў Эстоніі роўнымі, калі не гаспадарамі. Большасьць эстонскіх беларусаў асуджаюць дэмантаж помніку. З асуджэньнем выступіла і Зінаіда Клыга, кіраўніца «бел-чырвона-белае» беларускае суполкі.

Нацыянальныя меншасьці ў Таліне наракаюць на моўную дыскрымінацыю і скла-




DRIVE-ALIENN.LIVEJOURNAL.COM

**Дзясяткі людзей атрымалі траўмы — парэзы бітым шклом ад вітрынаў.**

**Працяг на старонцы 6.**

# Ледавіковы пэрыяд

Як мусульмане ў Заходняй Эўропе, расейскамоўныя жыхары Балтыі ня хочуць ці ня могуць інтэгравацца ў грамадзтва, арыентаванае на эўрапейскія каштоўнасьці. Піша **Віталь Тарас**.

## Браты па розуму

Пісьменьнік Аляксандар Геніс у адным са сваіх твораў апісвае забаўны эпізод. Пасяліўшыся ў ЗША, ён перапісваўся са знаёмымі ў горадзе, у якім жыў перад тым, як эміграваць з СССР. Ягоны сусед-амэрыканец, аднойчы ўбачыўшы надпіс на капэрце, ня вытрываў і спытаў у Геніса, што гэта за арганізацыя зь дзіўнай назвай EESTI. Той патлумачыў, што гэтак завецца адна маленькая дзяржава ў Эўропе, побач з Расеяй. Сусед не паверыў — ня можа быць краіны з такой назвай. І сапраўды, Эстонія па-эстонску нагадвае ў напісаньні нейкую загадкавую абрэвіятуру. Напрыклад, SETI (міжнародны праект пошуку незямных цывілізацыяў).

Для беларусаў Эстонія за савецкім часам і была чымсьці накшталт іншапляпэтнай цывілізацыі. Ня проста «амаль што замежжам», як Літва, куды можна было паехаць цягнікам на нядзелю, а нейкай фантастычнай эўрапейскай выспай на савецкай эўразійскай прасторы. Дзе жывуць суворыя, але справядлівыя хлопцы з паўночным характарам.

Мне давялося пабыць у Эстоніі толькі аднойчы — напярэдадні жнівеньскага путчу ў Маскве адпачываў разам з сям’ёй у Ранамызе. Праўда, скласьці ўражаньне пра Эстонію на падставе курортнага мястэчка на ўзьбярэжжы — усё адно што меркаваць пра Латвію паводле адных толькі Дубултаў ці пра Ўкраіну паводле ўражаньняў ад Ялты.

А вось Талін…Ніводзін з эўрапейскіх гарадоў, у якіх давялося пабываць, ня можа, па-мойму, параўнацца з Талінам у нейкай неправўдападобнай, амаль цацачнай прыгажосьці, чысьціні і адчуваньні нейкай унутранай свабоды напалам з утульнасьцю. Не магу ўявіць вуліцы Таліна, засыпаныя бітым шклом ад разгромленых вітрынаў разрабаваных крамаў, арматурай, кавалкамі бэтону, залітыя крывёй. І ўсё гэта ў мірны час. Кадры з эстонскай сталіцы нагадваюць Парыж, бунт арабскіх прадмесьцяў. Бунт, у якім галоўнымі героямі выступаюць падлеткі і маргіналы.

І тут ня толькі зьнешняе падабенства. І тут і там мы бачым, фактычна, канфлікт цывілізацыяў. Падобна большасьці мусульманаў у краінах Заходняй Эўропы, большасьць расейскамоўных жыхароў краінаў Балтыі ня хоча ці ня можа інтэгравацца ў грамадзтва, арыентаванае на эўрапейскія каштоўнасьці.

Ня стаўшы яшчэ цалкам эўрапейскім і цывілізаваным, гэтае грамадзтва ў сваю чаргу дыскрымінуе сваіх учорашніх «крыўдзіцеляў» — этнічных расейцаў. Паміж дзьвюма часткамі грамадзтва расьце мэнтальная сьцяна ўзаемнага неразуменьня і нецярпімасьці. А тут яшчэ «вялікі сусед» на Ўсходзе ніяк ня хоча прымірыцца з тым, што Літва, Латвя, Эстонія больш не «нацыянальныя ўскраіны» і ніколі імі ня будуць зноў. Хутчэй, Расея ўсё больш ператвараецца ва ўскраіну сучаснай цывілізацыі. І ад гэтага яе кіраўніцтва стараецца дробна помсьціць сваім суседзям — сябрам НАТО, пры кожным зручным выпадку.

## Партыя дурняў

Усё гэта ніякім чынам, на мой погляд, не апраўдвае апошнія дзеяньні кіраўніцтва Эстоніі. У кожным канфлікце, нават на побытавым узроўні, заўсёды больш вінаваты разумнейшы і маральна мацнейшы. На ім ляжыць большая адказнасьць.

Ваяваць з магіламі — сама па сабе гнюсная справа. Нават калі на Тынісьмягі пахаваныя ахвяры звычайнага ДТП (ёсьць вэрсія, што ля помніка савецкім воінам-вызваліцелям у Таліне пахаваныя некалькі савецкіх салдатаў, якія нападпітку трапілі пад савецкі танк), дык і ў гэтым выпадку шоў з дручкамі ў цэнтры гораду выглядае, як мінімум, непрыгожа.

Біць вітрыны таксама непрыгожа.

Але няўжо ўладам было няясна, да чаго можа прывесьці дэмантаж помніка, калі больш паловы апытаных жыхароў Таліна выступалі супраць гэтага?

І хто перашкаджаў ціха ды спакойна праводзіць археалягічныя раскопкі з мэтай ідэнтыфікацыі парэштак загіблых цягам папярэдніх 17 гадоў? Чаму менавіта цяпер, праз 17 гадоў аднаўленай незалежнасьці, эстонскаму ўраду спатрэбілася ў тэрміновым парадку пераносіць зьненавідны помнік савецкім акупантам?

Ніводзін чалавек, хоць крышку знаёмы з савецкай гісторыяй, ня будзе спрачацца з фактам савецкай акупацыі Эстоніі — і да вайны з фашысцкай Нямеччынай, і пасьля яе, з фактамі дэпартацыі эстонскіх грамадзянаў у Сібір, масавых рэпрэсіяў супраць эстонцаў (і ня толькі, як вядома, эстонцаў).

Але ж дэмантаваны помнік не камусьці з камуністычных дзеячоў, не савецкаму палкаводцу, не расейскім салдатам нават — салдатам савецкага войска самых розных нацыянальнасьцяў, якія воляю лёсу і гісторыі загінулі ў змаганьні зь гітлерцамі на тэрыторыі Эстоніі. Чым яны вінаватыя перад эстонскім народам?

І няўжо сумленьне ўсіх без выключэньня эстонцаў абсалютна чыстае перад гісторыяй? Эстонцы, напрыклад, як і прадстаўнікі іншых эўрапейскіх народаў, былі сярод тых, хто акупаваў Беларусь разам зь немцамі падчас Другой усясьветнай вайны. Пра гэты факт я ведаю, дарэчы, ня з кнігаў, але ад свайго бацькі й дзеда, якія былі ў акупацыі.

Зразумела, праз 60 зь лішнім гадоў пасьля заканчэньня вайны варта было б перастаць дзьмуць у фанфары і бяздумна хваліцца перамогай, якая далася цаной такіх калясальных чалавечых ахвяраў. А самае галоўнае —даўно трэба паклапаціцца аб тым, каб знайсьці і пахаваць усіх ахвяраў вайны, каб увекавечыць іх памяць. І ня толькі савецкіх грамадзянаў.

На жаль, у Беларусі дагэтуль не прыняты закон аб упарадкаваньні магілаў нямецкіх жаўнераў. Гэта патрэбна ня толькі немцам. Гэта патрэбна народам, якія лічаць сябе пераможцамі ў Другой усясьветнай вайне. Інакш гэта азначае, што вайна нікога і нічому не навучыла. Дый вялася яна, значыць, ня дзеля перамогі гуманізму.

Але пра тое, як ставяцца да магілаў — і чужых, і сваіх — у суседняй Расеі гаварыць цяпер ня варта. Таму што гэта ніякім чынам, зноў жа, не апраўдвае эстонскіх кіраўнікоў.

Некалькі гадоў таму на чарговых выбарах у парлямэнт Эстоніі прайшлі некалькі дэпутатаў ад афіцыйна зарэгістраванай Партыі дурняў. Гэта былі інтэлігентыя адукаваныя людзі з добрым пачуцьцём гумару, якія сваімі дэмаршамі высьмейвалі бюракратызм, ідыёцкія законы і правілы, якіх хапае ў кожнай сучаснай дзяржаве, выкрывалі некампэтэнтнасьць, а часам проста глупства некаторых палітыкаў. Ня ведаю, што сталася з той партыяй. Але тых дэпутатаў вельмі не хапае, мне падаецца, у цяперашнім эстонскім рыйкідагу. А можа, наадварот — акурат цяпер тая партыя атрымала перамогу над здаровым сэнсам?

## Паляваньне на вядзьмарак

На вялікі жаль, мы бачым, як дзеяньні некаторых палітыкаў, абраных цалкам дэмакратычным шляхам у эўрапейскіх посткамуністычных краінах, часам ставяць пад пагрозу ўсе папярэднія дэмакратычныя заваёвы. Здавалася, што гэткія парадоксы магчымыя толькі ў нас у Беларусі ці ў той самай Расеі, якія набылі свабоду пасьля 70 гадоў камуністычнага рабства і варварства. Але, як выявілася, самі па сабе дэмакратычныя пераўтварэньні, уступленьне ў эўраатлянтычны альянс і нават Эўразьвяз, дэкамунізацыя і люстрацыя — гэта яшчэ не гарантыя ад рэцыдываў бальшавіцкага мысьленьня і проста палітыканства.

Самы яскравы прыклад — спроба пазбавіць дэпутацкага мандату ў Эўрапарлямэнце прафэсара Браніслава Герэмка, легендарнага дзеяча «Салідарнасьці», бліскучага інтэлектуала, чалавека з бездакорнай рэпутацыяй, аднаго з выдатных прадстаўнікоў Польшчы. Ён адмовіўся запаўняць нейкую чарговую анкету, фармальна парушыўшы тым самым новы закон аб люстрацыях. Герэмэк пайшоў на гэта сьвядома, каб дапамагчы, паводле ягоных словаў, сотням сваіх калегаў — прафэсараў, літаратараў, мастакоў, якія жывуць у страху, якія прыніжана чакаюць ад дзяржаўных чыноўнікаў вырашэньня свайго лёсу, пераадолець страх і абараніць сваю годнасьць.

Справа не ў законе аб люстрацыях, які сам па сабе неабходны. А ў тым, каб чыноўнікі і палітыкі рознага рангу не маглі выкарыстоўваць яго ў сваіх вузкіх карысьлівых мэтах і партыйных інтарэсах, у мэтах помсты й расправы.

Менавіта гэтая практыка дала падставы дэпутатам Эўрапарлямэнту з самых розных фракцыяў гаварыць аб тым, што ў Польшчы вядзецца «паляваньне на вядзьмарак» у духу макартызму. (На самым пачатку 50-х гадоў мінулага стагодзьдзя ў ЗША ў мэтах барацьбы з камунізмам і савецкім шпіянажам была створана адмысловая камісія на чале з сэнатарам Макарці, якая вычышчала ўсіх падазраваных у спачуваньні камунізму з усіх сфэраў. Ахвярамі кампаніі сталі, сярод іншых, вядомыя галівудзкія рэжысэры, а таксама літаратары, навукоўцы, акторы і нават музыкі.)

Лідэр ультраправай каталіцкай Лігі польскіх сем’яў, якая ўваходзіць у кіроўную кааліцыю разам з партыяй «Закон і справядлівасьць» братоў Качыньскіх, віцэ-прэм’ер Раман Гертых заявіў нядаўна, што ў адносінах паміж Польшчай і Расеяй пачаўся «ледавіковы пэрыяд». Гертыху, іншым польскім палітыкам дый проста палякам ёсьць за што крытыкаваць сучасную Расею. І ня толькі за выкарыстаньне эканамічнага шантажу (як у выпадку з забаронай на імпарт польскага мяса) у палітычных мэтах. Расейскае кіраўніцтва ня хоча ўспамінаць пра ахвяры Катыні, а ахвяраў Галакосту польскага паходжаньня, якія былі вывезеныя ў гітлераўскія канцлягеры з тэрыторыі, акупаванай СССР, залічвае да савецкіх грамадзянаў. Тым самым рэвізуецца прызнаньне Пакту Молатава-Рыбэнтропа юрыдычна нікчэмным. Таго самага Пакту, які зрабіў магчымым савецкую акупацыю краінаў Балтыі — у тым ліку Эстоніі.

Той самы Гертых у якасьці міністра адукацыі, падобна расейскім праваслаўным артадоксам, ваюе з тэорыяй Дарвіна, дамагаючыся забароны яе выкладаньня. А таксама з гомасэксуалістамі, пагражаючы карамі школам, якія дазваляюць у сябе выступаць геям-праваабаронцам.

Гэта ня значыць, што Гертых ня можа крытыкаваць палітыку Расеі ці сваіх палітычных апанэнтаў з Грамадзянскай плятформы або Дэмакратычнай лявіцы. Аднак у адданасьці ўлады, якую прэзэнтуюць людзі кшталту Гертыха, дэмакратычным прынцыпам і каштоўнасьцям даводзіцца моцна сумнявацца.

Нядаўна Аляксандар Лукашэнка на пытаньне адносна плянаў трансьляцыі спадарожнікавага тэлебачаньня на Беларусь адмахнуўся: бязглуздзіца, няхай яны самі спачатку там у сябе разьбяруцца. Маўляў — перш чым вучыць дэмакратыі іншых, разьбярыцеся з дэмакратыяй у сваёй краіне.

Гэты дэмагагічны прыём у палеміцы зусім ня новы. Ім актыўна карысталіся за савецкім часам. Тым больш дзіўна і брыдка чуць у наш час папрокі на адрас ураду Эстоніі ці ЗША з боку кіраўніцтва Расеі, якое працягвае «спэцапэрацыі» ў Чачэніі і лупцуе дручкамі «нязгодных» ва ўласных гарадах.

Але ж нянавісьць да нашчадкаў савецкай імпэрскай палітыкі і праяваў нэасталінізму ў Расеі ці Беларусі не здымае адказнасьці зь лідэраў эўрапейскіх краінаў за ўласныя дзеяньні.

Як казаў Станіслаў Ежы Лец, «і рэспублікамі правяць голыя каралі».

# Начная бітва за гісторыю

Працяг са старонкі 3.

даную працэдуру натуралізацыі. Многія зь іх дагэтуль ня маюць эстонскага грамадзянства, умова яго наданьня — валоданьне эстонскай мовай.

У Маскве праўрадавыя арганізацыі моладзі ў адказ на перанос помніку заблякавалі эстонскае пасольства. Дыпляматам удалося адно толькі вывезьці зь яго дзяцей і цяжарную супрацоўніцу. Пратэстоўцы нават удзерліся на пляцоўку амбасады і абарвалі дзяржаўны сьцяг Эстоніі. Пратэсты эстонскіх дыпляматаў сілы ня мелі, а Эўрасаюз па стане на аўторак устрымліваўся ад умяшаньня.

Ролю адваката Эстоніі ў ЭС выконвае польскі прэзыдэнт Лех Качыньскі. Тым часам былы канцлер Нямеччыны Гергард Шродэр далучыўся да тых, хто лічыць перанос помніку блюзьнерствам.

Перанос помніку быў ажыцьцёўлены на падставе закону пра «забароненыя пабудовы», г.зн. якія праслаўляюць 50-гадовую савецкую акупацыю Эстоніі.

Насуперак распаўсюджанай расейскімі тэлеканаламі інфармацыі аб тым, што Бронзавага салдата разрэзалі на часткі, ужо 1 траўня помнік быў наноў устаноўлены на могілках. 8 траўня, у Дзень Эўропы, мяркуецца яго афіцыйнае адкрыцьцё. Ля помніку знойдзеныя парэшткі дванаццаці чалавек. Пачалася іх ідэнтыфікацыя.

**Мікола Бугай**

Бронзавы салдат пераўсталяваны на вайсковых могілках.



REUTERS

Талінская вуліца пасьля пабоішча.



# Перазахаваньне

Што было б, каб па вуліцах Масквы хадзіў натоўп, рабаваў крамы і скандаваў: «Эстонія, Эстонія!»? Піша **Руслан Равяка**.

Па Другой усясьветнай вайне на баранавіцкіх могілках былі пахаваныя савецкія салдаты, сярод якіх былі нават некалькі высокіх афіцэраў, два палкоўнікі. Празь некалькі дзясяткаў год могілкі зьнесьлі, бо яны апынуліся ў цэнтры гораду. На іх месцы пабудавалі гаркам партыі (цяпер гарвыканкам) і плошчу Леніна.

Савецкіх жаўнераў ціха перанесьлі на іншыя могілкі, на край гораду. Клады ж проста зраўнялі зь зямлёю, а там былі пахаваньні расейскіх і нямецкіх жаўнераў часоў першай вайны, польскіх вайскоўцаў ды простых жыхароў гораду. І цяпер падчас раскопаў не-не ды выкопваюць невядомыя труны.

Сёньня расейцы пераймаюцца брацкай магілаю савецкіх жаўнераў у Таліне. Хочуць эстонцы перахаваць забітых салдат з цэнтру сталіцы на іншым месцы... Уявіце сабе могілкі на нашай плошчы Незалежнасьці, ля каралеўскага замку ў Варшаве...

Ёсьць лясы пад Вязьмаю, куды дасюль забаронены ўваход — замінавана. Там жа каскі, там жа косткі... І такіх «брацкіх магілаў» у Расеі мноства... Тым нябожчыкам не пашчасьціла — яны загінулі не ў Прыбалтыцы, а ў Расеі. Прыгожыя словы пра апошняга пахаванага салдата — патрыятычная балбатня для электарату.

Расейцы плянуюць распачаць эканамічную блякаду Эстоніі. Крамы выкідаюць эстонскія сыры й кансэрвы. Палітыкі абяцаюць абмежаваць імпарт, экспарт і транзыт праз малую краіну. Сёлета тое ўжо рабілі зь беларускімі прадуктамі, летась — з грузінскімі таварамі, яшчэ раней — з малдаўскімі. Толькі Эстонію гэта мала палохае — краіна ў

# «Усе свае, зіг хайль!»

Піша Аляксандар Класкоўскі.

Прасканаваў расейскае сеціва. Ну няўжо ніхто з прадстаўнікоў тамтэйшай інтэлігенцыі не асьмеліцца пайсьці супраць шавіністычнай плыні, згенэраванай падзеямі ў Таліне?

Знайшоў: Віктар Шандаровіч, праграма «Плаўлены сырок» на радыё «Рэха Масквы». Вядомы сатырык, можна сказаць, уратаваў гонар расейскай інтэлігенцыі.

Адразу агаваруся: я ня стаўлю на мэце грунтоўны аналіз дзеяньняў эстонскіх уладаў у гісторыі з Бронзавым жаўнерам. Наколькі яны былі ўзважанымі — асобная тэма. Зазначу толькі, што забурэньняў варта было чакаць. Незадоўга да пачатку раскопак талінская газэта «Postimees», напрыклад, зьвяртала ўвагу на тое, што мясцовыя радыкальныя абаронцы манумэнта актыўна кантактуюць з расейскімі дыпляматамі, а ў талінскім гатэлі (69 эўра за суткі) пасяліліся актывісты руху «Нашы». Дый адзін зь лідэраў руху «Начны дазор» загадзя абяцаў мясцовым уладам «сюрпрызы» (пра гэта пісаў «Коммерсантъ»).

Але цяпер гаворка пра іншае. Атрымаўшы падставу для закідаў, расейскія дзеячы як з ланцуга сарваліся. Эліта краіны, што зноў прэтэндуе на статус вялікай, у канфлікце з маленечкай Эстоніяй дэманструе такі неадэкватна-гістэрычны тон, што мароз па скуры. Відавочна: у Маскве дасюль не зьмірыліся з тым, што былыя «малодшыя сёстры» — хай сабе гэта Эстонія, Грузія ці Беларусь — ужо незалежныя, і гэта назаўсёды. Згадайце, як тыя самыя дзеячы пырскалі сьлінай з расейскіх тэлеэкранаў падчас нафта-газавага канфлікту між Масквой і Менскам.

Між тым, беларускія дзяржаўныя мэдыі падпяваюць расейскім шавіністам. Зноў даюць эфір для антыэстонскай і антызаходняй рыторыкі. Ужо забыліся, як з Расеі гучалі заклікі кінуць на Беларусь расейскі дэсант (гэтак сама цяпер палохаюць Талін Пскоўскай дывізіяй).

Зразумела, прапагандысты найперш вырашаюць свае піяраўскія задачы. У прыватнасьці, на тле вулічных сутыкненьняў у Таліне менскіх амонаўцаў можна рэклямаваць як анёлаў. Звыш таго, зручная нагода лішні раз закінуць Брусэлю падвойныя стандарты. І, нарэшце, напалохаць айчыннага абывателя «нацыкамі з апазыцыі», якія падчас «Чарнобыльскага шляху», маўляў, брутальна зьбілі міліцыянта.

Беларуская тэлевізія цьвердзіць пра «эстонскі фашызм». Але нешта ня згадваецца, каб айчынныя афіцыйныя мэдыі білі ў званы, калі выйшаў скандальны артыкул былога міністра Сівакова. Дый тутэйшая Фэміда, як вядома, палічыла, што аўтара ня варта прыцягваць да адказнасьці, бо артыкул са станоўчымі ацэнкамі напісанага фюрэрам афіцэрскага кодэксу мае «публіцыстычны характар».

Віктар Шандаровіч таксама прыводзіць красамоўны прыклад з сэрыі пра парушынку ў чужым воку. Аказваецца, 21 красавіка ў Маскве прайшоў санкцыянаваны мітынг прыхільнікаў Гітлера. Дый нацысцкая літаратура ў Белакаменнай прадаецца, бы гарачыя піражкі. Мусіць, тамтэйшая ўлада таксама лічыць, што гэтае чытво мае «публіцыстычны характар».

Між тым, менавіта маскоўскі мэр Лужкоў цяпер у ліку завадатараў антыэстонскай гістэрыі. Разгледзеў нацызм за тысячу вёрстаў. Што ж да згаданага мітынгу ў Маскве, то, як іранізуе Шандаровіч, «усе свае, зіг хайль!».

Лужкоў заклікаў да байкоту эстонскіх тавараў. Дарэчы, на долю Расеі прыпадае 8,8% эстонскага экспарту. Так што байкот хоць і непрыемны, але не сьмяротны. Беларусь у гэтым пляне залежыць ад Расеі значна мацней. Сёлета за студзень-люты на долю Расеі прыпала 39,9% нашага экспарту.

Мне ж сярод усіх водгукаў на падзеі найболей спадабаўся вось гэты гумар Хэндрыка Ільвэса: «Можа, мы і гарачыя эстонскія хлопцы, тугадумы, але пасьля 15 гадоў варожай рыторыкі і мы можам задумацца: можа, яны нас ня любяць?»

Эўразьвязе й можа лёгка прадаваць свае тавары ў Эўропу.

Эстонскія ўлады маглі б распачаць перахаваньне й пасьля дня Перамогі. Але ж яны рабілі гэта з захаваньнем працэдуры, абвесьціўшы ўсім пра свае намеры, па выніках абмеркаваньня ў парлямэнце. Не на сьметнік выкідваюцца косткі ваяроў — на могілкі. Хоць для большасьці эстонцаў саветы як нацысты. Пазбавілі краіну незалежнасьці, забілі дзясяткі тысяч людзей.

Пікетаваньне эстонскай амбасады ў Маскве нагадвае добра знаёмыя менскія акцыі патрыётаў. Пра тое, што добрую частку пратэстоўцаў у Таліне складалі грамадзяне Расеі, замоўчваецца. (Хіба што абмовіліся адзін раз, што візы ў цэлай каманды расейскай моладзі былі ануляваныя ў апошні момант на вакзале.) Памятаеце, што нашыя ўрадавыя СМІ пісалі пра ўкраінцаў і грузінаў, якія ехалі ў Беларусь?

А разгон марадзёраў?.. Што было б, каб па вуліцах Масквы хадзіў натоўп, рабаваў крамы, падпальваў машыны і скандаваў: «Ічкерыя, Ічкерыя!»? Пра зарэзанага грамадзяніна Расеі — ужо ж не паліцыя зарэзала нажом хлопца.

Найхутчэй, такая ўвага Расеі да малой балтыйскай краіны — штучнае адцягваньне электарату ад унутрырасейскіх праблемаў і свайго разгону апазыцыі.

За апошнія гады Расея пасьпела пасварыцца па некалькі разоў з усімі сваімі суседзямі. Праўда, рабілася гэта абачліва — па чарзе. Сваркі гэтыя пачаліся з ростам цэнаў на нафту. Тую імпэрскасьць чакае ломка па падзеньні энэргетычнай каньюнктуры. Падобнае падзеньне ў 80-х прывяло да вядомых падзеяў у 1990—91 гадах.

Мы робімся сьведкамі пачатку супрацьстаяньня вялікіх краінаў. Тыя ж зацягваюць у вір канфлікту сваіх малых суседзяў. Адны ратуюцца ад таго віру, караскаючыся з усёй сілы на востраў Эўразьвязу. А Беларусь? Палохае лёс Беларусі. Бо кідаюць нас у той стары вір, дзе ўсё звыкла й знаёма...

*Баранавічы*




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Пераўзыходзячы чаканьні

Нягледзячы на татальнае ачапленьне плошчы Якуба Коласа і акцыі запалохваньня ля Акадэміі навук, «Чарнобыльскі шлях» сабраў тысячы маніфэстантаў. Абсалютную большасьць зь іх складала моладзь.

Роўна а пятай гадзіне плошча Якуба Коласа была перакрытая міліцыянтамі і людзьмі ў цывільным. Усе крамы, у тым ліку найбольшы ў краіне ЦУМ, былі замкнёныя «з тэхнічных прычынаў». Улада старанна выпрацоўвае новыя тактыкі барацьбы з нацыянальнымі маніфэстацыямі.

А шостай гадзіне ля плошчы Якуба Коласа з боку ЦУМу пачалі зьяўляцца палітыкі. Прыйшлі заяўнікі — Аляксей Янукевіч, Юрась Зяньковіч, Валянціна Палевікова. Тут жа быў і Аляксандар Мілінкевіч. Літаральна праз некалькі хвілінаў Зяньковіч заклікаў людзей накіроўвацца да Акадэміі навук. Спачатку калёна налічвала пару соцень чалавек, але яна пастаянна набірала моц.

«Маладафронтаўцы» ўзьнялі першыя бел-чырвона-белыя сьцягі і разгарнулі расьцяжку «Чарнобыльскі шлях», дзяўчаты раздавалі папяровыя сьцяжочкі. Здавалася, што іх у руках трымала палова калёны.

У сваю чаргу частка людзей зьбіралася ля Акадэміі навук. Першым транспарант разгарнуў былы па-




**Актыўны ўдзел у шэсьці ўзялі анархісты.**

літвязень Сяргей Скрабец — «Свабоду Казаліну». Потым пачалі зьяўляцца нацыянальныя, менскія, эўрасаюзаўскія, агэпэшныя сьцягі, чырвона-чорныя анархісцкія штандары, былі сьцягі хрысьціянскай дэмакратыі. Частка моладзі была апранутая ў жоўтыя саколкі, на тварах — рэсьпіратары.

Пасьля таго як дзьве калёны злучыліся, меркавалася, што выступіць прафэсар Нікітчанка, які мусіў агучыць рэзалюцыю «Чарнобыльскага шляху-2007», але ў горадзе была арыштаваная гукаўзмацняльная апаратура, таму выступу не адбылося. Арганізатары дачакаліся, пакуль на пляцоўку да Акадэміі навук падцягнуцца ўсе ўдзельнікі акцыі. Здавалася, што людзей ня меней, чым было тут на мітынгу на Дні Волі. Юрась Зяньковіч у мэгафон заклікаў людзей ісьці да Чарнобыльскай капліцы.

Перад пачаткам акцыі назіральнікі прагназавалі, што шмат людзей адмовіцца ісьці да Бангалору. Насамрэч так не адбылося, калёна дружна рушыла ў бок вуліцы Сурганава. Мілінкевіч быў верны сваім ранейшым словам, што болей ня пойдзе на Бангалор, і застаўся раздаваць аўтографы.

Амапаўцы надзейна перакрылі праспэкт, каб ніхто не спрабаваў рухацца ў бок Нацыянальнай бібліятэкі. Нікому не карцела прарываць кардоны.


WWW.NAVINY.BY

Улада сіліцца, каб маніфэстанты чуліся ізаляванымі. Тысячы службістаў удзельнічаюць у акцыях запалохваньня, але гэта, здаецца, толькі ўзмацняе ў пратэстоўцаў пачуцьцё маральнага абавязку.


CHARTER97.ORG

**Дзеяньнямі амонаўцаў кіраваў палкоўнік Падабед.**

На вуліцы Сурганава былі разабраныя ходнікі, там праходзяць рамонтныя дарогі, таму рухацца даводзілася па праезнай частцы. Звычайныя міліцыянты і не супраціўляліся гэтаму. Колькасьць людзей усё павялічвалася. Жыхары вуліцы Сурганава віталі акцыю вывешваньнем бел-чырвона-белых сьцягоў на балконах, аўтамабілісты сыгналілі ў знак падтрымкі.

У пачатку калёны несьлі расьцяжку «Чарнобыльскі шлях». Яшчэ крыху папэрадзе магутныя салігорцы Павал Батуеў і Ільля Шыла несьлі Чарнобыльскі звон. У першым шэрагу ішлі Віктар Івашкевіч, Вінцук Вячорка, Вячаслаў Сіўчык, Анатоль Сідарэвіч. У цэнтры калёны — Сяргей Калякін і Анатоль Лябедзька.

Шэсьцем вельмі ўдала кіравалі Зьміцер Хведарук і Яраслаў Грышчэня, хлопец з Баранавічаў, шосты абвінавачаны ў справе «МФ». Грышчэня мае лідэрскую харызму. Людзі прыслухоўваюцца да яго-

**Працяг на старонцы 10.**


АРЦЁМ ЛЯВА

**Маніфэстанты рухаюцца па вуліцы Сурганава.**

# Пераўзыходзячы



АРСЕНІЙ ПАХОМАЎ

**Каля Акадэміі навук 26 красавіка людзей было ня менш, чым на Дзень Волі.**

**Працяг са старонкі 9.**

ных словаў, робяць так, як ён кажа. Цяпер не падаецца дзіўным, чаму менавіта гэты хлопец паўстане перад судом. У такіх, як Грышчэня, улады бачаць вялікую небясьпеку.

Дэманстранты мелі расьцяжкі з надпісамі «Малады фронт», «Будуючы новую АЭС — помні пра памылкі мінулага», «Беларусь без АЭС», «Рукі прэч ад чарнобыльскіх ільгот», «Атам мірным не бывае», «Не — другому Чарнобылю», «За альтэрнатыўную энэргію».

На скрыжаваньні вуліц Сурганава і Якуба Коласа міліцыянты пачалі выцясьняць людзей на тратуар, пад’ехала два дзясяткі машынаў зь мігалкамі. Пачаліся невялікія сутычкі, міліцыянты паспрабавалі затрымаць найбольш актыўных удзельнікаў, але людзі іх адбілі.

Урэшце, пад’ехалі два дзясяткі міліцэйскіх машынаў, літаральна адціскаючы людзей, і дэманстранты былі вымушаныя такі збочыць на ходнікі, раз-пораз пераскокваючы праз яміны і груды друзу. Колькасьць удзельнікаў дасягнула 7-10 тысяч чалавек.

За маніфэстацыяй назіралі дыпляматы краінаў Эўрасаюзу і ЗША. Кіраўнік аддзяленьня швэдзкага пасольства Эрыксан наступным чынам пракамэнтаваў акцыю: «Не настолькі істотна, колькі людзей выйшла, галоўнае, што людзі засьведчылі гатоўнасьць выходзіць. Прыемна, што сярод людзей пануе такі пазытыўны настрой».

Недзе а восьмай шэсьце падышло да Чарнобыльскай капліцы. Выступіў прафэсар Іван Нікітчанка, зачытаў тэзы рэзалюцыі «Чарнобыльскага шляху». Пасьля была агучаная малітва за Беларусь, а скончылася ўся акцыя дваццаць адным ударам у Чарнобыльскі звон.

«Чарнобыльскі шлях» пацьвердзіў вялікую мабілізацыйную гатоўнасьць прыхільнікаў пераменаў. Колькасьць удзельнікаў веснавых акцыяў апазыцыі пераўзышла нават самыя сьмелыя прагнозы. Асноўную масу маніфэстантаў склала моладзь. Сярод тых, хто прыйшоў на акцыю, не было ўпадніцкіх настрояў, людзі выпраменьвалі пазытыў.

Улада сіліцца, каб маніфэстанты чуліся бяспраўнымі і ізаляванымі. Тысячы амапаўцаў і супрацоўнікаў розных органаў удзельнічаюць у акцыях запалохваньня і ачапленьня, але гэта, здаецца, толькі ўзмацняе ў пратэстоўцаў пачуцьцё маральнага абавязку.

Уражваў 18-гадовы хлопец са Смаргоні, Уладзімер Шульжыцкі, выпускнік прыборабудаўнічага ПТВ. Яго затрымалі, ведаючы, што ён зьбіраецца ў сталіцу, і выпусьцілі аб 11.15, нібы на зьдзек, бо апошні цягнік з гораду ад’яжджае аб 11.30, а да станцыі далёка. Тады хлопец сеў на ровар і праехаў 40 км да Маладэчна, каб стуль сесьці на электрыч-



WWW.SVABODA.ORG

**Выступае праф. Нікітчанка, старшыня аргкамітэту «Шляху».**

# чаканьні


WWW.SVABODA.ORG

Ля Чарнобыльскай капліцы.

ку.

…Калі людзі вярталіся па вуліцы Сурганава, адбыліся драматычныя сутычкі моладзі са спэцназам. Прычынай была адмова юнакоў згарнуць бел-чырвона-белыя сьцягі. Пасьля штурханіны ў аўтазаку аказаліся шаснаццаць чалавек. Сярод іх — адзін з заяўнікаў «Шляху» Юрась Зянькові́ч. Іх адвезьлі ў Цэнтральны РУУС, пратрымалі пару гадзінаў, узялі адбіткі пальцаў, сфатаграфавалі і выпусьцілі.

У той сытуацыі чорнакашульнікі-амапаўцы не разьбіралі ні старога ні малога. Сярод зьбітых аказаліся 70-гадовы літаратуразнаўца Ўладзімер Содаль і ягоная пэнсіянэрка-жонка. Малалетні вязень нацызму, які доўгія гады вёў на ТВ праграму «Роднае слова», спадар Содаль скажа горкія словы: «Амонаўцы дзейнічалі нечакана і нахабна. Я мог бы адбегчы, але годнасьць не дазволіла. Чаму я, які перажыў у дзяцінстве страшныя гады акупацыі, павінен у незалежнай Беларусі ў мірныя дні бегчы?»

У.Содаль не зьбіраецца падаваць скаргу на дзеяньні супрацоўнікаў МУС, бо лічыць гэта бессэнсоўным.

**Зьміцер Панкавец**


WWW.NAVINY.BY

**Амонаўцы пайшлі ў атаку, калі юнакі не пагадзіліся згарнуць сьцяг.**

### «Чарнобыльскаму шляху» не было альтэрнатывы

ЦУМ, музычная крама «Гасьцінец», унівэрсам «Сталічны», букмэкерская кантора ў пераходзе ст.м. «Плошча Якуба Коласа», крамы «Іў Рашэ», «Эўраопт», «Бэргхаўс», «Фуджыфільм» не працавалі 26 красавіка пасьля 16–й гадзіны «па тэхнічных прычынах», у аптэцы № 28 акурат у гэты час «распачаўся сандзень».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Нецьвярозыя ліквідатары ўшанавалі пахаваньне чарнобыльскіх ільгот

Ля Чарнобыльскай капліцы па вул. Карастаянава а 15-й прайшло афіцыйнае мерапрыемства, прымеркаванае да 21-й гадавіны Чарнобылю.

Ужо на падыходах да капліцы было чуваць жалобную музыку. Ля помніку ахвярам катастрофы сабраліся пару соцень чалавек. Збольшага студэнты і школьнікі, якіх прымусова даставілі на мерапрыемства. На заплечніках у некаторых маладзёнаў былі значкі «За свабоду».

У беразьняку побач зьбіраліся групкі ліквідатараў. Пілі гарэлку, успаміналі. Пасьля некаторыя ішлі да помніку, большасьць кіравалася далей ад гэтага месца.

Высокія чыноўнікі, уключна з галоўным ідэолягам краіны Алегам Пралягкоўскім, ускладвалі вянкі да помніку. Студэнты клалі гвазьдзікі. Граў вайсковы аркестар. Было зусім мала дзяржаўных журналістаў.

За пару мэтраў ад помніку пачалася валтузьня. Міліцыянты не давалі прайсьці п'янаму ліквідатару. Той крычаў: «Дайце прайсьці на пахаваньне... Пахаваньне Чарнобыльскіх ільгот». Пасьля махнуў рукой і сышоў да сяброў. Яны ўтрох абняліся, пачалі ўспамінаць тых, каго болей няма зь імі, а потым заплакалі.

Яшчэ праз пару хвілін мерапрыемства скончылася, студэнты радасна скіраваліся па сваіх справах. Праз некалькі гадзінаў на гэтым самым месцы прайшла апазыцыйная акцыя.

**ЗП**

# 40 км на ровары, каб трапіць на «Чарнобыльскі шлях»

Радыё «Свабода» паведамляла пра Ўладзімера Шульжыцкага — хлапца са Смаргоні, якога прыцягнулі да суду за тое, што ён распаўсюджваў самаробныя ўлёткі з указаньнем хваляў радыё «Свабода». Судовую справу пры гэтым завялі паводле звыклага абвінавачаньня ў лаянцы. 26 красавіка 18–гадовы Ўладзімер выправіўся ў Менск на «Чарнобыльскі шлях». Зь ім сустрэўся й пагаварыў **Ігар Карней**.



WWW.SVABODA.ORG

## «Даверлівасьць падвяла...»

**— Уладзімер, гэтая спроба прыцягнуць Вас да адказнасьці першая?**

— Так, першая. Але перад Днём Волі мяне таксама шукалі. Я тады яшчэ ў смаргонскім ПТВ прыборабудаваньня вучыўся. Зрэшты, тады ўсім бацькам тэлефанавалі дахаты выкладчыкі, каб нікуды не адпускалі дзяцей.

Канечне, ад такога псыхозу было страшна. На прэзыдэнцкія выбары ў Менск не паехаў, таксама вельмі баяўся. Ну, а як скончыў вучэльню, дыплём атрымаў, то ўжо страх невялікі.

**— Можаце выказаць меркаваньні, як апэратыўнікі выйшлі на ваш сьлед?**

— Я, напэўна, занадта даверлівы. На кожным аркушыку пазначаў свой нумар тэлефона: калі ў кагосьці ўзьнікнуць складанасьці з настройкай, то можна тэлефанаваць, і я дапамагу, бо амаль усе савецкія прымачы ведаю.

У адзін такі дзень я ішоў на працу, і мне патэлефанаваў чалавек. Папрасіў зайсьці, дапамагчы з настройкай. Даў адрас. Я, натуральна, пайшоў. І зусім забыўся, што будзе «Чарнобыльскі шлях», а так бы скеміў, што, хутчэй за ўсё, ловяць (перад Днём Волі дык дні тры я хаваўся)…

Перад самымі дзьвярыма па ўказаным адрасе мяне чакаў участковы яшчэ зь нейкім міліцыянтам. Заявілі, што ў гэтым пад’езьдзе зьдзейсьнены кватэрны крадзеж, і яны нібыта правяраюць.

Я ім паказаў пашпарт, усе свае дакумэнты, якія меў пры сабе. Гэтага аказалася недастаткова, і давялося ехаць у пастарунак. Там ужо я даведаўся, што нецэнзурна лаяўся на мінакоў, не рэагаваў на заўвагі міліцыі, за што і правёў ноч у камэры.

**— Пра самвыдат у пратаколе не пісалі?**

— Канечне, пра гэта ніхто і ня згадваў. Калі чытаў матэрыялы справы, нідзе гэтыя лісткі не праходзяць.

## Круці пэдалі

**— Ведаю, у Менск дабіраліся з прыгодамі...**

— Патрапіў даслоўна пад самы «Чарнобыльскі шлях», пад самы пачатак. З суду выпусьцілі дзесьці аб 11.15. А аб 11.30 адыходзіў апошні цягнік, якім бы я мог пасьпець на «Чарнобыльскі шлях».

Але было да таго прыпынку кілямэтры два — і я, вядома, не пасьпеў. Таму да Маладэчна ехаў на ровары. Гэта сорак кілямэтраў. Крыху больш чым за дзьве гадзіны даехаў. А ўжо з Маладэчна ў Менск заехаў на электрычцы.

**— Уладзімер, што Вас увогуле падштурхнула браць на сябе выдаткі, распаўсюджваць самаробныя ўлёткі з хвалямі «Свабоды»?**

— Выдаткі тут невялікія, найбольш часу проста пайшло. Я ў камputарах ня вельмі разьбіраюся, але як мог у «Ўордзе» зрабіў таблічкі, зьмясьціў там надпісы з хвалямі. Потым аднёс да чалавека, які дапамог гэта ўсё размножыць.

**— Іншымі словамі, бракуе ў рэгіёнах крыніцаў інфармацыі?**

— Ясна, не хапае. Што цяпер людзі ведаюць? Была газэта «Свабода», якую я разносіў. І тое яна ўжо не прыходзіць. «Народную волю» калі хтосьці й выпісвае, то на ўсю маю акругу, можа, чалавекі два-тры. Дый тое людзі, якія хочуць, абсалютна ня ведаюць, дзе на яе падпісацца і як.

## Ад лукашыста — да дэмакрата

**— Можаце ўвогуле сказаць, хто паўплываў на вашы перакананьні?**

— Да дзясятай клясы я ўвогуле быў шчырым лукашыстам. Але, паціху слухаючы радыё «Свабода», пачаў зьмяняць перакананьні. Канчаткова пераламаўся якраз перад леташнімі прэзыдэнцкімі вы-

барамі.

Пайшоў да Дзергачова, прапанаваў свае паслугі... Аляксандар Дзергачоў — гэта наш смаргонскі праваабаронца. Калісьці выйграў справу ад імя ААН супраць нашых смаргонскіх уладаў.

Увогуле ў Смаргоні ён даволі знакаміты чалавек. Якраз перад выбарамі ён раскідваў самвыдат «Права на волю», «Наш смаргонскі край». І ў гэтых газэтах, таксама, як і я цяпер, даваў свой нумар тэлефона. Перад выбарамі я ўжо раскідваў улёткі за Мілінкевіча, потым зьявілася газэта «Свабода». А перад самымі выбарамі ў мясцовыя саветы Дзергачоў прапанаваў мне вылучыць сваю кандыдатуру.

**— Як людзі рэагавалі, калі бачылі такога юнага кандыдата?**

— Па-рознаму рэагавалі. Хтосьці перад носам зачыняў дзьверы. Хтосьці гэта вітаў: маўляў, даўно пара зьмяніць уладу. Сам зьбіраў за сябе подпісы, усю сваю акругу абышоў, 1040 чалавек, са сваімі ўлёткамі. Мяркую, калі ўлічваць узрост і ўсё астатняе, у мяне мусіла быць працэнтаў пяцьдзясят. Налічылі 70 на 30 — на яго карысьць.

### «Засьвяціўся» — будзь палітыкам

**— Пачынаючы актыўную палітычную дзейнасьць у такім маладым узросьце, разумееце, што гэта ў беларускіх умовах мае сваю спэцыфіку?**

— Павінен жа быць чалавек, які гэтым бы займаўся. Іншых такіх людзей у маім асяродку няма. Сяк-так, натуральна, падтрымліваюць. Але яны могуць толькі пазычыць удачы, падзякаваць за тое, што прынёс «Народную волю» ці дапамог настроіцца на «Свабоду».

Але ўсяго астатняга людзі баяцца. Яшчэ раз паўтару: свой выбар я зрабіў, калі пайшоў да Дзергачова. І калі цяпер параўноўваць з выбарамі, то гэта ўжо ня так страшна.

**Радыё «Свабода»**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Халодны Першамай

Надвор’е на Першамай было не вясеньнім — ішоў сьнег і дзьмуў халодны вецер. Але нягледзячы на выбрыкі прыроды, на першамайскую акцыю апазыцыі сабралася блізу тысячы чалавек.

Людзі пачалі зьбірацца ля Акадэміі навук а 11:00, адтуль міліцыянты выціснулі іх да Дому друку. Пастаяўшы тамака некалькі хвілінаў, калёна ў суправаджэньні спэцназу рушыла па Сурганава ў бок Бангалору. Публіка была розная — ад чубатых анархістаў да сівых вэтэранаў вайны.

Ад пачатку шэсьця практычна не было ніякай сымболікі, апроч некалькіх сьцягоў АГП, але на падыходах да Бангалору іх станавілася ўсё болей, колькасьць людзей таксама расла. Пачалі зьяўляцца бел-чырвона-белыя і чырвоныя (пэкэбоўскія) зь сярпом і молатам штандары. Разам зь людзьмі ішоў невялічкі аркестар, які выконваў старыя савецкія маршы. Калёна час ад часу спрабавала гукаць «Жыве Беларусь!», але досыць млява.

Ужо на Бангалоры асноўную калёну чакалі 150-200 чалавек. Яшчэ пазьней падышла калёна сацыял-дэмакратаў зь бел-чырвона-белымі партыйнымі сьцягамі. Агулам было каля тысячы чалавек. Практычна ўсе трымалі ў руках нейкія сьцягі ці транспаранты. Чырвоныя штандары пераўзыходзілі па колькасьці бел-чырвона-белыя. Расьцяжкі ў большасьці былі на сацыяльныя праблемы.

Шмат было выступаў палітыкаў, але ніводзін зь іх не вылучаўся. Адзін Сяргей Скрабец выступіў па-беларуску. Аляксандар Бухвостаў зачытаў рэзалюцыю акцыі, якая была адзінагалосна падтрыманая.

Пасьля сьпявалі музыкі PLAN, «Чырвоным па белым», «Таварыш Маўзэр», Зьміцер Бартосік. Чытаў вершы Андрэй Хадановіч.

Дзесьці а другой акалелыя маніфэстанты разышліся.

**Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

### Ці варта апазыцыі ладзіць масавыя маніфэстацыі часьцей?

| | |
|---|---|
| Так | 146 (75.3%) |
| Не | 34 (17.5%) |
| Гэта ня ўдасца | 14 (7.2%) |

Усяго прагаласавала: 194.

# Бруд на адрас жонкі Мілінкевіча

Іна Кулей, жонка Аляксандра Мілінкевіча, зьвярнулася з заявай у пракуратуру Менску. І.Кулей просіць пачаць крымінальную справу па факце разьмяшчэньня на сайце intimby.net у разьдзеле «знаёмства» анкеты аб прадастаўленьні платных інтымных паслуг зь яе кантактнай інфармацыяй.

«З моманту разьмяшчэньня аб'явы мне ня раз тэлефанавалі з прапановамі інтымнага характару. Часта тэлефанаваньні насілі абразлівы характар. Разьмяшчэньне дадзенай аб'явы з пазначэньнем майго мабільнага тэлефона носіць наўмысны характар і накіраванае на абразу мяне і паклёп», — гаворыцца ў заяве.

І.Кулей мяркуе, што мэта такіх дзеяньняў — псыхалягічны ціск на яе і яе мужа.

Аналягічны прыём невядомыя ўжылі супраць 16-гадовай Насты Палажанкі, абвінавачанай па справе незарэгістраванай патрыятычнай арганізацыі «Малады фронт».

**Мікола Бугай**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Іна Кулей і Аляксандар Мілінкевіч падчас акцыі ў абарону Зьмітра Дашкевіча.**

## Лукашэнка не даруе антысавеччыкам

Кіраўнік Беларусі паслаў спачуваньне па Лаўрову, праігнараваў Растраповіча. На сайце прэзыдэнта Беларусі разьмешчанае спачуваньне на адрас дзяцей расейскага актора Кірыла Лаўрова. Спачуваньня па знаным расейскім музыку Мсьціславу Растраповічу, які памёр у адзін дзень з Лаўровым, няма.

Прэзыдэнт Расеі Ўладзімер Пуцін выказаў спачуваньні з нагоды сьмерці абодвух артыстаў.

Варта нагадаць, што Растраповіч у савецкі час быў залічаны ў антысавеччыкі пасьля таго, як даў прытулак на сваёй дачы гнанаму адусюль і бяздомнаму пісьменьніку Салжаніцыну. Растраповіча пачалі ўціскаць, і ўрэшце ён разам з жонкай, сьпявачкай Вішнеўскай, вымушаны быў пакінуць СССР. Вярнуўся ён толькі ў часе перабудовы.

**Барыс Тумар**

## Набор у беларускамоўныя гімназіі пад пагрозай

Згодна з Законам «Аб агульнай сярэдняй адукацыі», навучаньне паводле гімназічных праграмаў мае пачынацца зь пятай клясы. Гэта значыць, што ўсе пачатковыя клясы павінны перавесьціся з гімназіяў у агульнаадукацыйныя школы. Набор у першыя клясы гімназіі дазваляецца, толькі калі ад гэтага раёну школа далёка.

Дырэктарка менскай беларускай гімназіі №23 Ніна Нікіціна патлумачыла, што такой праблемы ў яе навучальнай установе ня будзе. Адбыўся круглы стол з удзелам намесьніка міністра адукацыі Казімера Фарыны і дэпутатаў парлямэнту. Пастанавілі пачаць набор у 1 і 2 клясы 15 траўня. «Потым, у 5-й клясе, будзе позна вучыць дзяцей мове», — адзначыла Н.Нікіціна і запрасіла ўсіх ахвотных прыводзіць дзетак у сваю гімназію.

Зь іншымі беларускімі гімназіямі сытуацыя пакуль няясная. Сытуацыя непрыемная: калі не дазволяць набору ў першыя клясы і дзеткам зь беларускіх сем'яў прыйдзецца хадзіць у блізкія расейскамоўныя клясы, бацькам будзе цяжэй рашыцца перавесьці іх у гімназіі пасьля пачатковай школы.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### 3500 подпісаў за пяць дзён

3,5 тыс. подпісаў за зьмены ў Закон «Аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях» сабралі хрысьціяне-эвангелісты. Яны разьлічваюць на 50 тыс. подпісаў пад зваротам да прэзыдэнта, Канстытуцыйнага суду і палаты прадстаўнікоў. Да кампаніі далучыліся некаторыя каталіцкія і праваслаўныя сьвятары.

### Забароненыя выразы «элітнае жыльлё», «прэстыжны раён»

Жыхарам Драздоў і іншых дарагіх кварталаў пры продажы катэджаў будзе складаней тлумачыць іх вартасьць.

Пастанова «Аб разьмяшчэньні рэклямы рыэлтарскімі арганізацыямі» забараняе рыэлтарам выкарыстоўваць у абвестках выразы «элітнае жыльлё», «прэстыжны раён» і інш.

Цяпер трэ будзе апісваць дэталі: прасторная плошча, кандыцыянэр, паркет з чырвонага дрэва.

Пастанову распрацавалі Міністэрствы гандлю і юстыцыі.

**МБ**

### Былая міністарка застралілася

Былая міністарка будаўніцтва Польшчы Барбара Бліда застрэлілася падчасператрусу ў яе доме.Ператрус праводзіўся сьледчымі Агенцтва ўнутранай бясьпекі ў рамках крымінальнае справы аб «адкатах» у вугальнай прамысловасьці. Хоць яе спрабавалі ратаваць, жанчына памерла на месцы.

**МБ**

# Канал TV Belarus афіцыйна зацьверджаны

Назіральная Рада Польскага грамадзкага тэлебачаньня зацьвердзіла стварэньне спадарожнікавага каналу для Беларусі «TV Belarus». Пачатак вяшчаньня, а гэта будзе 15 гадзінаў у суткі, заплянаваны на сярэдзіну кастрычніка. Мова каналу — беларуская. У праграме — інфармацыя, музыка, культура, гісторыя. На фінансаваньне тэлебачаньня ўжо выдаткаваныя каля 4 млн. эўра са спэцыяльнага фонду МЗС Польшчы.

**Радыё «Свабода»**

# Судзьдзя Таманаў адмовіўся весьці справу маладафронтаўцаў

Адзін зь лідэраў незарэгістраванага «Маладога фронту» Барыс Гарэцкі атрымаў пазоў у суд Савецкага раёну на 8 траўня. Нагода — атрыманьне пазову на судовае паседжаньне, дата якога пакуль невядомая. Па яго словах, крымінальную справу супраць удзельнікаў арганізацыі будзе весьці іншы судзьдзя, чым меркавалася раней, — Руслан Анісковіч. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, судзьдзя Аляксей Таманаў адмовіўся весьці справу «Маладога фронту», спаслаўшыся на стан здароўя.

Нагадаем: па справе праходзіць шэсьць чалавек — Наста Палажанка, Зьміцер Хведарук, Алег Корбан, Барыс Гарэцкі, Аляксей Янушэўскі, Яраслаў Грышчэня. Ім інкрымінуецца арт. 193-1 КК (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі), паводле якога прадугледжваецца штраф або арышт на тэрмін да шасьці месяцаў або пазбаўленьне волі на тэрмін да двух гадоў.

Колькасьць фігурантаў справы можа і павялічыцца. Салігорскіх актывістаў «МФ» выклікаюць на гутаркі ў КДБ. У сераду пазовы атрымалі Максім Гаміцэвіч і Зьміцер Ефімовіч. Непаўнагадовых Сержука Ткачука ды Рыгора Астапеню адвезьлі на гутарку наўпрост са школы. Адзін зь лідэраў салігорскай арганізацыі Іван Шыла кажа, што супрацоўнікі КДБ наведваюць школы, у якіх вучацца сябры арганізацыі. На гутарку выклікаюць і тых, у каго заўважаць апазыцыйную сымболіку. З маладых людзей бяруць «добраахвотныя тлумачэньні». Іх распытваюць пра дзейнасьць «МФ» у горадзе, пра лідэраў, пытаюцца пра Насту Азарку зь Нясьвіжу ды Паўла Красоўскага з Жодзіна. Менавіта пасьля такіх «добраахвотных тлумачэньняў», узятых зь сябраў баранавіцкай філіі «МФ», была заведзеная крымінальная справа на Яраслава Грышчэню, кажа Іван Шыла. Паводле салігорскіх «маладафронтаўцаў», гутаркі ладзяцца зь ініцыятывы капітана УКДБ па Менску й Менскай вобласьці Дзьмітрыя Сьвістуна.

**СП**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 26 красавіка

#### Дашкевіча вяртаюць

Лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту» трапіў у шпіталь на абсьледаваньне са шклоўскай калёніі, дзе яго прымушалі працаваць на лесапільным участку, хоць яму балела сьпіна. Перад вяртаньнем у калёнію Зьміцер меў спатканьне з бацькамі. Нагадаем, **Зьміцер Дашкевіч** пакараны на паўтара году зьняволеньня за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. За кратамі хлопец болей за дзевяць месяцаў.

#### Затрыманы Хамайда

**Барыс Хамайда** атрымаў двое сутак арышту па арт. 23.34 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі альбо правядзеньня масавага мерапрыемства альбо пікетаваньня), бо ўсталяваў у цэнтры Віцебску невялічкі звон у памяць Чарнобыльскай трагедыі й раз–пораз у яго званіў. Пікет цягнуўся каля дзесяці хвілінаў. Потым міліцыянты даставілі апазыцыянэра ў Чыгуначны РУУС Віцебску.

#### Клімаву не даюць чытаць

Адміністрацыя СІЗА адмовілася прыняць літаратуру для палітвязьня. Начальнік аддзелу па выхаваўчай працы **маёр Дзянісік** паведаміў: кнігі можна браць толькі зь бібліятэкі ізалятару. Раней адміністрацыя СІЗА адмовілася перадаць Клімаву радыёпрымач. **Андрэй Клімаў** у СІЗА з 3 красавіка. Палітыка вінавацяць у закліках да гвалтоўнага зьвяржэньня ўлады, нібыта зьмешчаных у яго артыкуле ў інтэрнэце.

#### Статкевіч ізаляваны

Палітвязень **Мікола Статкевіч**, які адбывае пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі, быў ізаляваны ў памяшканьні камэндатуры Пухавіцкага раёну на час «Чарнобыльскага шляху». Гэтак Статкевіча ізалююць рэгулярна: падчас правядзеньня масавых вулічных акцыяў ці ўдзелу Лукашэнкі ў мерапрыемствах на адкрытым паветры.

#### Затрымалі пасьля «Шляху»

Пасьля жалобнага мітынгу былі на кароткі час затрыманыя спэцназам: **Юры Шамкаловіч, Людміла Атакулава, Іван Сьпірін, Кацярына Краснова, Кацярына Галіцкая, Мікалай Сяргеенка, Алесь Лісіенка, Уладзімер Сяргееў, Вячаслаў Вяткоўскі, Валянцін Сакалоўскі, Алесь Прэнін, Васіль Прасянкоў, Кацярына Рамашкевіч, Юлія Сяўцова, Юры Зяньковіч**. Пад гарачую руку была схопленая і 10–гадовая дзяўчынка, якую міліцыянты закінулі ў аўтобус разам з затрыманымі, а потым адпусьцілі толькі на вул.Арлоўскай.

#### Затрыманьні ў Віцебску

Старшыню віцебскай абласной суполкі Партыі БНФ **Кастуся Смолікава**, кіраўніка гарадзкой суполкі **Ўладзіслава Токарава** і актывіста **Сяргея Белазеку** спэцназ затрымаў на Ўсьпенскай горцы, дзе прадстаўнікі дэмсілаў сабраліся ўшанаваць памяць ахвяраў Чарнобылю. К.Смолікаву і С.Белязеку суд даў па 2 базавыя велічыні штрафу. У.Токараў асуджаны на 3 ночы арышту.

#### Два мітынгі ў Магілёве

26 красавіка ў Магілёве адбыліся два мітынгі — афіцыйны й апазыцыйны. На афіцыйны мітынг сабраліся збольшага школьнікі. Прадстаўнікі магілёўскай аб'яднанай апазыцыі ўсклалі кветкі да памятнага знаку ля гарадзкіх могілак. На альтэрнатыўны мітынг прыйшло сорак чалавек. Ксёндз Магілёўскага касьцёлу сьв. Станіслава **а. Раман** правёў малебен за Беларусь. Мітынг скончыўся гімнам «Магутны Божа».

#### Мур наведаў Фінькевіча

Намесьнік амбасадара ЗША ў Беларусі **Джонатан Мур** наведаў 26 красавіка актывіста моладзевага руху **Артура Фінькевіча** на «хіміі» ў Магілёве. Размова праходзіла ў прысутнасьці начальніка спэцкамэндатуры. Дж.Мур запэўніў, што ЗША будуць і далей патрабаваць ад беларускіх уладаў вызваленьня ўсіх палітвязьняў.

### 27 красавіка

#### На мяжы затрыманыя

На польска–беларускай мяжы былі часова затрыманыя студэнты, што вучацца ў Польшчы па праграме Каліноўскага. У часе мытнага нагляду ў **Вольгі Шэпель**, **Алены Камаровай**, **Віктара Кісьлюка**, **Паўла Крэсіка**, **Алеся Ванчука**, **Андрэя Аксаміта** й **Аляксея Трубкіна** адабралі пашпарты. А.Трубкін, карыстаючыся тым, што мытнікі, пакінуўшы на стале пашпарты, выйшлі з кабінэту, узяў свой пашпарт і пайшоў. З астатнімі правялі «прафіляктычную гутарку» людзі ў цывільным, якія не прадставіліся. Яны пыталі, ці ведаюць студэнты, хто ажыцьцяўляе наркатрафік праз польска–беларускую мяжу і хто возіць выбуховыя рэчы.

### 29 красавіка

#### Сапёры на сходзе дэмсілаў

Да гомельскага офісу АГП, дзе праходзіў рэгіянальны сход дэлегатаў апазыцыі, прыехалі міліцыя і сапёры. Яны заявілі, што паступіў ананімны сыгнал, быццам у двары дому — снарад, і патрабавалі агляду памяшканьня і падворку. Гаспадары не дазволілі, і міліцыянты зьехалі.

**СП**

# Тут будзе саўна і боўлінг

Рэпартаж **Сяргея Харэўскага** зь Менску XVII стагодзьдзя. Фота **Алеся Матафонава**.



У кляштарных мурах міжволі апаноўвае трымценьне перад старажытнасьцю. Сюды апошнія паўтара стагодзьдзі не ступала нага навукоўца. Пасьля паўстаньня 1863 г. расейскія карнікі ўладкавалі тут свае кашары, а касьцёл перарабілі на царкву. За саветамі ў мурах сьвятыні разьмяшчаўся архіў, а ў кляштарным комплексе — вайсковая пракуратура. Літаральна месяц таму вайскоўцы пакінулі гэтыя муры. І адразу ж зьявіўся праект прыстасаваньня кляштару пад гатэльны комплекс, які выклікаў шырокі пратэст грамадзтва. А пакуль тое, у кляштары ліхаманкава працуюць археолягі. Дый журналісту з фотакамэрай пашчасьціла трапіць за мур. Парадаксальна: за калючым дротам расейска-савецкай ваеншчыны захаваўся куток



**На гэтым кантрафорсе мусіла стаяць званіца.**

**Кляштар бэрнардынаў** быў заснаваны па фундацыі 1624 г. краснасельскага старасты Андрэя Кансоўскага і яго брата Яна. Манахам перадаваўся драўляны дом на ўсходнім баку Верхняга Рынку. У 1630–я бэрнардынцы збудавалі драўляныя касьцёл і канвэнт. Комплекс згарэў у 1644 г. Да 1652 г. былі адбудаваныя ўжо каменны касьцёл Сьв.Язэпа і кляштарны корпус. Пасьля паўстаньня 1863 г. у кляштары разьмясьціліся расейскія вайсковыя кашары, касьцёл перарабілі на праваслаўную царкву. У савецкі час у кляштары была вайсковая пракуратура. Сёлета вайскоўцы пакінулі муры. Цяпер, згодна з праектам, зацьверджаным Менгарвыканкамам, кляштар і касьцёл стануць часткай гатэльнага комплексу. Праект выклікае пратэст грамадзкасьці.



**Падмуркі дому Кансоўскіх.**

Менску XVII стагодзьдзя, якога і знаку няма ў іншых месцах.

Вось, напрыклад, у двары нас сустракае… магутнае каменнае ядро, што некалі захрасла ў кляштарнай муроўцы. Але спраўна выштукаваны майстрамі мур не паддаўся! Пукатае ядро гэтак і засталося ў сьцяне.

А вось, перад праходам у атвор брамы, над якою месьціцца капліца, бачым вялізарны кантрафорс. Суцэльны, бяз арак і нішаў, складзены з валуноў і цэглы, шырынёю ў некалькі мэтраў! На гэтым цыклапічным падмурку мусіла стаяць вежа-званіца, праект рэканструкцыі якое быў складзены яшчэ 200 гадоў таму.

Некалькі кляштарных двароў, злучаных сыстэмаю пераходаў і калідораў, яшчэ прыцярушаныя казарменным савецызмам, але гэтае шумавіньне адпадае хутчэй, чым можна было сабе ўявіць. Па дварах раскіданыя рэшты турэмна-вайсковае гаспадаркі: батарэі, чарупіны, дыхта нагляднае агітацыі, шыльдачкі з надпісамі па-беларуску, кшталту «адзіночная камэра» і г. д. Паблукаўшы па калідорах, натрапіў на ўзор інсітнага манумэнтальнага мастацтва: роспіс на пастаральную тэму… Дзіўна бачыць гэты непрэтэнцыйны й шчыры ўзор саматужнае творчасьці невядомага салдата на старажытнай сьцяне…

Але, не зважаючы ні на што, муры сьвятыні дыхаюць самай сапраўднай даўнінай. На дзіва, тут перахавалася куды болей памятак мінуўшчыны, чым можна было сабе ўявіць: галерэі й анфіляды перакрытыя крыжовымі скляпеньнямі, лябірынт магутных сутарэньняў сыходзіць глыбока пад зямлю, на паверх ніжэй, пад дарогу. Тут яшчэ можна ўбачыць сьведчаньні савецкага сярэднявечча: сьляпыя камэры-карцэры, закратаваныя тупікі, сьцянныя шафы для зброі і брутальнага выгляду агульная прыбіральня… проста пад касьцёлам. Пад нагамі шастаюць шэрыя грызуны.



**Каменнае ядро, што патрапіла ў кляштарны мур 300 гадоў таму…**







Гэты антураж востра кантрастуе з абстаноўкаю кабінэта вайсковага пракурора, аздобенага пад правінцыйны бардэль: двухспальны ложак, аксаміт, хвальбоны, фіранкі, графіны й вазы, люстэркі й пляфоны, ладная колькасьць пустое шклатары…

Але засталіся й пяты скляпеньняў, старасьвецкія печы, нішы-аўтары і…

**Працяг на старонцы 18.**

Працяг са старонкі 17.

# Тут будзе саўна і боўлінг

невыказны, непадробны дух даўніны. Ён і прапаў адсюль за паўтара стагодзьдзі. Што тут будзе далей?

Археолягі Аляксандар Егарэйчанка і Юры Каласоўскі, якія кіруюць тут работамі, хваляцца ўнікальнымі знаходкамі. Проста пасярод двара выяўлены падмурак вялікага будынку, не пазначанага ні на якім зь вядомых плянаў. Верагодна, гэта і ёсьць палац краснасельскага старасты Андрэя Кансоўскага і яго брата Яна, якія ў 1624 г. перадалі бэрнардынам пад рэзыдэнцыю драўляны дом на ўсходнім баку Верхняга Рынку.

Кожны лапік зямлі тут — неацэнны скарб для археоляга. Бо пад культурным слоем часоў пабудовы кляштару, сярэдзіны XVII ст., ідуць магутныя плясты ранейшых эпохаў. А.Егарэйчанка з пэўнасьцю сьцьвярджае, што тут быў і пасад старажытнага Менску XII—XIII ст., пра што красамоўна сьведчаць размаітыя артэфакты, наканечнікі стрэлаў й фрагмэнты старажытнае зброі…









З вокнаў будучага гатэлю адкрываюцца ўнікальныя віды на вуліцы і двары Верхняга гораду.



Археалягічныя знаходкі сьведчаць: у кляштары палілі (зьверху — файка, урыгожаная арнамэнтам), пілі і стралялі (зьлева ад бутэлькі — куля зь пісталі).



Брама ў іншы сьвет.

На добры лад тут, з вытрыманьнем усіх археалягічных мэтодыкаў (умацаваньне сьценаў раскопаў, прасейваньне грунту, кансэрвацыя знаходак і г. д.), раскопкі мусяць весьціся колькі гадоў… А колькі ў іх ёсьць часу — археолягі ня ведаюць.

Згодна з праектам ўладаў, ансамбль кляштару мае быць перабудаваны ня толькі звонку. Аўтары праекту мяркуюць актыўна выкарыстоўваць падземную прастору для разьмяшчэньня паркоўкі, «спартова-аздараўленчага, дзелавога цэнтраў».

Ад камэнтароў адносна будучыні ўнікальнага архітэктурна-археалягічнага ансамблю навукоўцы ўстрымліваюцца. А што да плянаў пабудовы тут гатэлю з паркінгам ды басэйнам, то разводзяць у скрусе рукамі.



Старасьвецкія печы з савецкімі юшкамі.



У нядаўнія часы тут і судзілі, сюды й садзілі.

Роўна 150 гадоў таму, у 1857 г., у альманаху «Teka Wilenska» быў надрукаваны клясычны нарыс Уладзіслава Сыракомлі «Менск». Ёсьць у ім і пра кляштар бэрнардынаў: «Занадта мала набраўшы матэрыялу ў дачыненьні да касьцёлу й кляштару тутэйшых бэрнардынаў, мы захацелі займець тлумачэньні ад саміх манахаў. Але адзін з нашых сяброў, якога ўдалося ўгаварыць сабраць мясцовы матэрыял, трапіў пад злыя насьмешкі тутэйшае ўлады. Адгаворваліся ад яго і тым, і гэтым, не паказалі нават славутае бібліятэкі, што пасьля пажару ўсё яшчэ не даведзеная да ладу. Пажар той быў у 1835 годзе, але больш як за дваццаць гадоў так і не сабраліся ўпарадкаваць тут кнігасховішча!»



Савецкая готыка: гальюны ў кляштарных сутарэньнях.

# Кніга пра беларускую разгубленасьць

Валер Булгакаў: апазыцыя знаходзіцца ў палоне навязаных уладай стэрэатыпаў.

У пятніцу ва Ўправе БНФ прайшла прэзэнтацыя кнігі «Беларусь: ні Эўропа, ні Расея. Меркаваньні беларускіх эліт». Арганізатары спрабавалі знайсьці іншае памяшканьне, але паўсюль сутыкаліся з адмовай.

Ва ўступным слове галоўны рэдактар часопісу «Arche» і ініцыятар выданьня Валер Булгакаў адзначыў: нягледзячы на пагаршэньне палітычнай сытуацыі ў краіне, летась назіраўся сапраўдны выдавецкі бум. Булгакаў прадэманстраваў кнігі, у выданьні якіх удзельнічаў непасрэдна. Толькі яны маглі б заняць цэлую паліцу.

Новая кніга пабудаваная ў форме анкет. Кожны суразмоўца адказвае на пэўны набор пытаньняў. На трохстах старонках прадстаўнікі эліт імкнуліся сфармуляваць, што ёсьць беларускай ідэнтычнасьцю, якое месца займае Беларусь у сьвеце, якія мусяць быць адносіны з Эўропай і Расеяй. В.Булгакаў расказаў, як праходзіў адбор герояў кнігі: пытаньне, хто ёсьць у Беларусі элітай, было прапанаванае палітолягам. Утварыўся сьпіс асобаў. Шмат хто зь меркаваных герояў кнігі не пагадзіўся на інтэрвію — як старшыня Фэдэрацыі прафсаюзаў Леанід Козік, старшыня праўладнага саюзу пісьменьнікаў Мікалай Чаргінец, спартоўцы Яніна Карольчык ды Макс Мірны.

Булгакаў падзяліўся сваімі адкрыцьцямі: з адказаў ён зразумеў, што афіцыйныя асобы разглядаюць Эўропу толькі ў прасторавай плосасьці, а ні якім разе ні ў культурнай, ні ў палітычнай. У сваю чаргу, беларускія контарэліты зноходзяцца ў стэрэатыпах, якія навязвае ім афіцыйны бок, як, скажам, пра тое, што беларусы талерантная і адукаваная нацыя.

Зь невялікай крытыкай кнігі выступілі беларускія расейскамоўныя філёзафы Янаў Палескі і Аляксандар Адамянц. Янаў Палескі адзначыў, што не зусім зразумела, у якім кантэксьце ў назьве ўжытае слова «эліта», а таксама — на каго кніга ў першую чаргу разьлічаная.

А.Адамянц адзначыў, што для яго былі цікавымі якраз меркаваньні людзей не з улады: «Што думаюць яны, мы прыкладна ўяўляем, а вось што думаюць на супрацьлеглым баку, пакуль не да канца вядома».

**Зьміцер Панкавец**

Том **«Беларусь: ні Эўропа, ні Расея»** зьмяшчае інтэрвію з трыццацьцю беларускімі палітыкамі, журналістамі, дзеячамі культуры і мастацтва, праведзеныя ўвесну 2006 году ў Менску. Нашым суразмоўцам былі зададзеныя дзевяць пытаньняў на тэму беларускай ідэнтычнасьці, узаемінаў Беларусі з Расеяй і Эўрапейскім Зьвязам. У выніку паўстаў зборнік, у якім пададзеныя разнастайныя і часам супярэчлівыя меркаваньні на вызначаную тэму.

Даслаўшы замову з пазначэньнем вашага імя, імя па бацьку і прозьвішча, а таксама дакладнага адрасу на адрас 220018, Менск, а/с 3, вы атрымаеце кніжку бясплатна. Просьба пазначаць мову, на якой замаўляецца выданьне: расейскую ці беларускую.

Вольга Абрамава, Сьвятлана Алексіевіч, Яўген Бабосаў, Анжаліка Борыс, Ірына Бугрова, Генадзь Бураўкін, Алесь Бяляцкі, Аляксандар Вайтовіч, Андрэй Вардамацкі, Вінцук Вячорка, Павал Данейка, Андрэй Дынько, Сьвятлана Калінкіна, Сяргей Калякін, Кася Камоцкая, Сяргей Касьцян, Вячаслаў Кебіч, Анатоль Лябедзька, Васіль Лявонаў, Жанна Літвіна, Алег Манаеў, Аляксандар Мілінкевіч, Анатоль Міхайлаў, Алесь Міхалевіч, Тацяна Процька, Андрэй Саньнікаў, Уладзімер Улаховіч, Валеры Фралоў, Станіслаў Шушкевіч, Усевалад Янчэўскі.

**Беларусь: ні Эўропа, ні Расея. Меркаваньні беларускіх эліт.** Варшава: Выдавецтва «ARCHE», 2006.

## СЬЦІСЛА

### Фэстываль ізраільскага кіно

Першы фэстываль ізраільскага кіно ў Беларусі зладзіць увосень пасольства Ізраілю. Усе стужкі будуць дубляваныя па-беларуску.

Таксама пасольства плянуе выдаваць кнігі па-беларуску. Летась выйшаў зборнік апавяданьняў ізраільскага пісьменьніка Этгара Керэта «Кіроўца аўтобусу, які хацеў стаць богам». Сёлета мае выйсьці зборнік твораў Узі Вайля.

Перакладчыкам зноў выступіць Павал Касьцюкевіч, які ўжо некалькі гадоў займаецца складаньнем габрэйска-беларускага слоўніку.

### Канцэрт «Крамы» — царскае дзела

Упраўленьне культуры Менгарвыканкаму рэкамэндавала арганізатарам канцэрту гурту «Крама» падаць заяўку ў вышэйшую інстанцыю — Мінкульт або адпаведны аддзел Адміністрацыі прэзыдэнта. Канцэрт плянавалася правесьці ў сярэдзіне траўня да выхаду новага альбому гурту.

Арганізатары не здаюцца: панясуць заяўку ў згаданыя структуры. «Крама» вядомая незалежнай пазыцыяй.

### Грае рог

Адзіны ў краіне ансамбль паляўнічай рагавой музыкі створаны ў Драгічыне. Яго ўзначальвае выкладчык музычнай школы Мікалай Шаўчук. Для паўнацэнных заняткаў малавата пакуль што інструмэнтаў. І Шаўчук зьвярнуўся да землякоў з просьбай падарыць старыя ражкі, у каго яны захаваліся. Аказалася, многія маюць такія сямейныя рэліквіі.

### Выдадзеныя вершы Ермаловіча

Прэзэнтацыя зборніку «Мікола Ермаловіч» адбылася 27 красавіка ў Менску.

Кніга падрыхтавана старшынём культурна-асьветніцкага клюбу «Спадчына» Анатолем Белым, сябрамі клюбу Анатолем Валахановічам і Надзеяй Сармант. У кнізе больш за сто вершаў Ермаловіча, 52 гутаркі і інтэрвію зь ім. Многае раней не публікавалася.

«Спадчына» прапануе таксама назваць яго імем вуліцу ў Маладэчне, дзе ён жыў шмат гадоў.

У часе імпрэзы артыст Уладзімер Цімашэвіч выканаў любімую песьню Міколы Ермаловіча і Васіля Быкава «Сумныя бярозы пабяліў мароз».

**Паводле БЕЛТА, БелаПАН, «Звязды»**

# Парфяновіч і Сініцын заклікалі да ўваходжаньня Беларусі ў Расею

Сустаршыня Фонду сацыяльна-эканамічнага супрацоўніцтва Леанід Сініцын і бізнэсовец, былы алімпійскі чэмпіён Уладзімер Парфяновіч абнародавалі «Менскі маніфэст беларуска-расейскага яднаньня».

Гэта палітычная плятформа прыхільнікаў беларуска-расейскай інтэграцыі. Аўтары пяюць дыфірамбы «яднаньню», заклікаюць да «стварэньня саюзнае дзяржавы на аснове расейскай канстытуцыі», г.зн. уваходу Беларусі ў склад Расеі на правах суб’екта Расейскай Фэдэрацыі. Першым крокам мае быць пераход на расейскі рубель. Таксама яны за передачу беларускіх нафта- і газаправодаў ва ўласнасьць саюзнай дзяржавы.

Дакумэнт выйшаў у сьвет на жоўтым расейскім сайце Stringer.ru. Сайт «Беларускі партызан» перадрукаваў яго без камэнтароў.

Варта нагадаць, што нядаўна іншая група палітыкаў (С.Скрабец, В.Фралоў) правяла мітынг на плошчы Бангалор у падтрымку інтэграцыі. Выйшаў канфуз: сабралася ўсяго 10 чалавек. Як бачым, у барацьбе за расейскую падтрымку ёсьць канкурэнцыя.

Абодва палітыкі, што падпісалі маніфэст, выйшлі з атачэньня Лукашэнкі. Сініцын быў кіраўніком Адміністрацыі прэзыдэнта і арганізатарам першага рэфэрэндуму, які заклаў асновы дзяржаўнага ладу. Парфяновіч быў абраны ў Палату прадстаўнікоў па прэзыдэнцкім сьпісе. Ні Сініцын, ні Парфяновіч не падтрымлівалі дэмакратычных кандыдатаў на выбарах 2001 і 2006 гадоў.

## Уладзімер Парфяновіч: «Нашу ідэю падтрымліваюць ва ўрадзе»

**Уладзімер Парфяновіч** адкамэнтаваў для «НН» «Менскі маніфэст беларуска-расейскага адзінства» і выказаўся за ўваход Беларусі ў склад Расеі.

**«Наша Ніва»: Зь якой мэтай ствараўся гэты рух?**

**УП:** Гэта наш крок, каб палепшыць адносіны з брацкім расейскім народам. Прабачце за грубасьць, але трындзёж пра аб’яднаньне, які мы штодня чуем па нашым тэлебачаньні, папросту дастаў. Ён не прыводзіць да рэальнага паляпшэньня адносінаў між краінамі. Мы выступаем за тое, каб пачалі выконвацца ўсе ранейшыя абавязаньні беларускага боку, што да інтэграцыйных працэсаў. Наша задача зрушыць беларуска-расейскі саюз зь мёртвай кропкі, у якую ён трапіў.

**«НН»: Вы першыя беларускія палітыкі апошніх гадоў, якія адкрыта «за» ўваход Беларусі ў склад Расеі.**

**УП:** Беларуская грамадзкасьць ужо сасьпела да гэтага кроку. Але гэта абсалютна не азначае страты сувэрэнітэту. Беларусь мае ўвайсьці ў склад Расеі на правах асацыяванага члена. І мы проста патрабуем выканаць абавязкі рэфэрэндуму 1995 г., калі пераважная большасьць беларусаў выказалася за цясьнейшыя адносіны з брацкім расейскім народам.

**«НН»: Што канкрэтна нам можа даць уваход у склад Расеі?**

**УП:** Зноў вас хачу супакоіць, гэта зусім не азначае страты сувэрэнітэту. І наагул я лічу, што такі крок дасьць новы імпульс для разьвіцьця беларускай мовы і культуры. Гэта абсалютна адназначна. Узрастуць эканамічныя сувязі, гэта будзе выгадна абсалютна ўсім. Беларускі бюджэт стане празрыстым, чаго няма цяпер. Хіба дрэнна? Хаця, мы разьвітаемся зь некаторымі атрыбутамі незалежнай дзяржавы.

**«НН»: Зь якімі менавіта?**

**УП:** Думаю, ня самымі прынцыповымі. Амаль жа ўсе эўрасаюзныя краіны перадаюць частку сувэрэнітэту Эўрапарлямэнту. Прыкладна тое будзе і ў нас. Канечне, будзе агульная валюта, але гэта зноў жа на карысьць беларускім бізнэсоўцам і прадпрымальнікам.

**«НН»: Дык чым статус Беларусі будзе розьніцца ад статусу Татарстану ці Якуціі?**

**УП:** Гэта абсалютна розныя рэчы. Мы ўвойдзем у склад Расеі як асацыяваны член, то бок мы мець сваю алімпійскую каманду, сяброўства ў ААН, сьцяг, герб.

**«НН»: А хто ўзначаліць такую дзяржаву?**

**УП:** Гэта ня самае прынцыповае пытаньне. Можа быць прэзыдэнт, можа — парлямэнт. У кожнай рэспубліке будзе свой кіраўнік, а хто зь іх будзе кіраваць усёй дзяржавай, высьветлім пазьней.

**«НН»: Вам не здаецца, што прыхільнікаў інтэграцыі ў беларускім грамадзтве меней з кожным годам? Гэта даказала і нядаўняя акцыя Сяргея Скрабца і Валер’я Фралова.**

**УП:** Тое, што людзі не прыйшлі на акцыю, гэта адно, а тое, што яны за саюз — зусім іншае. Пагаварыце зь людзьмі на вуліцы і пераканаецеся, што абсалютная большасьць беларусаў за саюз з Расеяй.

**«НН»: Хто ў Расеі падтрымаў Вашу ідэю?**

**УП:** Пра гэта рана казаць, але пераконваю вас, наша прапанова актыўна абмяркоўваецца ў верхніх эшалёнах расейскай улады. І хутка стане вядома, ці падтрымаюць там нас.

**«НН»: А ў Беларусі?**

**УП:** Падтрымліваюць практычна ўсе дзейсныя палітыкі беларускага ўраду. Я меў зь некаторымі такія размовы. Яны ня могуць першыя пачынаць такія ініцыятывы, але ў выпадку чаго заўсёды гатовыя нас падтрымаць.

**«НН»: Дык можна казаць, што ў Беларусі зьявілася новая прарасейская апазыцыя?**

**УП:** Калі ласка, не ўжывайце ў дачыненьні да нас такое слова. Мы не апазыцыя, бо маем канкрэтную пазыцыю. Апазыцыя каму? Уладзе? Дык там нас практычна ўсе падтрымліваюць. Хіба што апазыцыя аднаму канкрэтнаму чалавеку.

**Мікола Бугай, Зьміцер Панкавец**

**Камэнтар Рэдакцыі:** Нічога дзіўнага ў зьяўленьні такога дакумэнту няма. Уключыце тэлевізар: у дзяржаўным тэлепакеце 31 расейскамоўны канал, адзін дзьвюхмоўны «Лад» і ніводнага беларускамоўнага. Татальная ізаляцыя беларускай культуры лукашэнкаўцамі падрыхтавала глебу для зьяўленьня падобнай палітычнай праграмы.

# Голас нацыі

Рэакцыі чытачоў на артыкул **Сяргея Богдана** «Перазагрузка Беларусі» аналізуе аўтар. (Гэты артыкул стаў самым папулярным матэрыялам на сайце nn.by, на яго зьявілася болей за ўсё камэнтароў за мінулы месяц.)

Больш за дзьве сотні камэнтароў на «Перазагрузку Беларусі» — факт паказальнае цікавасьці да тэмы. Знаёмы маладэчанскі краязнавец трапна прыкмеціў — яшчэ гадоў дваццаць таму яму не было нават з кім паразмаўляць пра заняпад белкультуры, апроч Міколы Ермаловіча.

Белмоўныя знаходзяцца ў стане мабілізацыі — яны хочуць, каб было лепш, чым цяпер, а таму па азначэньні тое, што ёсьць сёньня, для іх — «кепска». Такая псыхалягічная ўстаноўка добрая ў кароткачасовых надзвычайных сытуацыях, але перашкаджае ў доўгатэрміновай пэрспэктыве, у прыватнасьці, пры ацэнцы і распрацоўцы стратэгіі. Яна вядзе да шкоднага канфрантацыйнага мысьленьня, маргіналізацыі ўласнае культуры і паўстаньня комплексу ахвяры.

Я прапанаваў чытачам параўноўваць стан рэчаў па больш аб’ектыўных крытэрах, што дазволіла б выпрацаваць рэалістычны плян дзеяньняў. Бо і вялізныя натоўпы барбараў цярпелі паразу перад дысцыплінаванымі рымскімі кагортамі.

## Каму ў БССР было добра

«Няхай гэты аптыміст пачытае інтэрвію Балаханава, які прызнаецца, што яму няма з кім паразмаўляць па-беларуску ў паўмільённым Гомелі», — хуценька азваўся на мой артыкул дыяспарны ўдзельнік форуму — **Палівач** з Тулы.

Але галоўны мэсыдж майго артыкулу быў ня ў тым, каб абвесьціць, што ў нас усё добра, а ў тым, каб абвесьціць, што мы паступова дасягаем посьпехаў. Нават калі Балаханаву і няма з кім размаўляць у Гомелі (што сьведчыць, бадай, пра пераборлівасьць гэтага пісьменьніка), але ж яму ё дзе друкаваць свае творы і выпусьціць кніжку. Ці было б гэта магчыма да пачатку цяперашняга Адраджэньня?

На маю прапанову параўнаць савецкія выданьні і кніжкі апошніх гадоў, **Палівач** запярэчыў: «Я пакладу для параўнаньня тэлепраграму 70-х, і яна пераважыць усе вашыя кніжкі накладам у 50—300 экзэмпляраў».

Але ж застаюцца акурат кніжкі, хоць бы і маланакладовыя, а ня тэлепраграма, што выкінецца праз тыдзень.

Палівачу запярэчыў і **Міхал**: «Навошта параўноўваць тэлепраграмы, калі ў 70-х нават у вялікіх вёсках былі ліквідаваныя беларускія школы, ... кагэбісты на допытах выкрыўляліся, што беларускамоўных патрыётаў можна зьмясьціць пад адзін каўпак. Сёньня беларускамоўнага знойдзеш практычна паўсюль».

Яго падтрымаў **Яўген**: «Палівач, нагадайце мне, якія вартыя ўвагі і сапраўды беларускія перадачы былі ў 1970-я гады!? Хіба што «Вецер вандраваньняў» ды «Запрашаем на вячоркі». Навіны ні пра што, толькі дыктар гаварыў па-беларуску. У параўнаньні з тымі гадамі цяпер — росквіт беларускасьці. Тады беларускасьць увогуле не разглядалася грамадзтвам як вартая ўвагі зьява».

На заяву Палівача, што ён меў у 1970-х гадах шыкоўныя беларускія выданьні, **Ёпс** адказаў: «Тады Вы «Рабінзона» прачыталі, а цяпер Вашы дзеткі ўжо і «Алесю ў дзівоснай краіне» могуць прачытаць у шыкоўным перакладзе па-беларуску. Прагрэс ёсьць. І тое, што мы цяпер гэта робім ужо ня дзякуючы Маскве, КПСС і мудраму правадыру, а насуперак — таксама знак часу, і хутчэй пазытыўны».

**Мікола** ж мяркуе, што «Адраджэньне было штучна прыдушанае». Але «беларуская культура не скарылася, тысячы людзей розных этнічных каранёў шчыруюць на беларускай ніве, разумеючы, што Беларусь павінна разьвівацца як эўрапейская нацыя».

## Самаробныя рэзэрвацыі

Галоўная бяда — гэта псыхалягічная загнанасьць белмоўных, якая шырока выявіла сябе падчас абмеркаваньня. Так, **Звычайны хлапец** кажа пра «беларускае апазыцыйнае падпольле». Маўляў, «беларускамоўныя ў нашай краіне — як старыя індзейцы цяпер у ЗША — жывуць у рэзэрвацыях, вакол усе размаўляюць на чужынскай мове, а хто маўляе на сваёй — выклікае зьдзіўленьне».

**Палівач** падхоплівае: «У адрозьненьне ад 70-х (калі яна была вясковай — як тут пішуць) мова маргіналізавалася, і цяпер ні вясковая, ні гарадзкая. Ні рыба, ні мяса». На гэта варта заўважыць, што індзейцаў у рэзэрвацыі заганялі, а некаторыя нашыя суайчыньнікі апусьцілі галовы самі, апяваючы «няўдачы». А сказана ж: «мова — дом Быцьця».

Але й жывы дух пра сябе заяўляў. **Абазнаны** дэкляраваў: «Я — за пазытыў! Тое, што беларуская мова перастала ўспрымацца як вясковая — вялікае дасягненьне. Хто мае дзяцей і хоча, каб яны размаўлялі не саромеючыся на роднай мове, зразумеюць мяне. Ня трэба, каб большасьць размаўляла па-беларуску. Трэба, каб пераважная бальшыня насельніцтва, нармалёва, без уздрыгаў успрымала беларускую фанэтыку і збольшага разумела лексыку».

Размаўляйце, і Вас зразумеюць.

## Моўныя мэтамарфозы

**Палівач** слушна гаворыць наконт дэрусіфікаванага стандарту белмовы: «Пакажыце мне хоць бы адзін паўнавартасны слоўнік гэтай «новай літаратурнай мовы», які дазваляе ёй «апэраваць». Але ён забываецца, што фармаваньне моўнага канону *завяршаецца*, а не пачынаецца складаньнем такога паўнавартаснага слоўніку. Калі, вядома, не ідзецца пра моўную інжынэрыю, як, прыкладам, Саветы былі парабілі русіфікаваныя слоўнікі для малых народаў яшчэ да таго, як тыя напісалі свае раманы.

Да ўніфікацыі схіляюцца многія, у тым ліку **С.см.**, бо мае «сумневы наконт пазытыўнасьці існаваньня разнабою ў правапісах. Адпалохвае гэта або проста зьбівае з толку. Асабіста мяне не задавальняе ні тарашкевіца,

**Працяг на старонцы 24.**

пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Голас нацыі

**Працяг са старонкі 22.**

ні наркамаўка, ні дзеясловіца. Я гатовы прыняць правапіс, які будзе вынікам усіхнага кансэнсусу. Адзін правапіс патрэбны, і чым хутчэй мы да гэтага прыйдзем, тым лепш».

Яго падтрымлівае **Domus**: «На сёньняшні дзень у мове робіцца бардак. Тэндэнцыя, калі калькі і запазычаньні з расейскай мовы замяняюцца іх польскімі аналягамі, — гэта шлях у тупік».

## Ня толькі мова

**Не размаўляй на мове акупантаў** зазначае: «Наш абавязак шанаваць і карыстацца нацыянальнай мовай не дыскутуецца. Але ёсьць рэчы ня менш важныя для нацыі, чым мова маўленьня. Гэта — рэлігійныя, палітычныя а эканамічныя правы і свабоды грамадзянаў. Эканамічныя праграмы лідэраў апазыцыі надзвычай цьмяныя, лукавыя, калі наагул ёсьць. Як будзе разьмеркаваная нацыянальная ўласнасьць на зямлю, прадпрыемствы, нерухомасьць? Выглядае так, нібыта «апазыцыйныя» прэтэндэнты на «Дом калхозьніка» маўкліва пагадзіліся з намэнклятурным раскраданьнем нацыянальнага багацьця і салідарна называюць гэта прыватызацыяй».

**Ня млявы** падтрымлівае гэтую думку: «Рамантычная зацыкленасьць профі-беларусаў ТОЛЬКІ на мове — прычына пэрманэнтных паразаў. У апазыцыі адсутнічае ясная палітычная крытыка сацыяльнай несправядлівасьці рэжыму. Баюся, што калі цуд здарыцца [апазыцыя пераможа], то мы ў першую чаргу ўбачым ня росквіт нацыянальнай сьвядомасьці, а росквіт банкаўскага махлярства й бандытызму».

Карацей, увага на эканоміку.

## Вёска і мова

Камандныя вышыні мадэрнай дзяржавы даўно знаходзяцца ў гарадах. Лёс беларушчыны цалкам залежыць ад гораду. Вядома, многія зь беларусаў маюць яшчэ сантымэнты да вёскі. **Палівач** мяркуе, што дагэтуль белмова «захавалася толькі дзякуючы таму, што яе носьбіты гэтыя стагодзьдзі былі несьвядомыя і неадукаваныя. Дапамагла пратрымацца і беларусізацыя 20-х, калі непісьменных сялян вучылі па-беларуску. Цяпер сытуацыя мяняецца. Беларускамоўная вёска вымірае. І ўсё. За ёй нікога». На гэтым тле посьпехаў дасягае «расейскамоўная беларуская нацыя».

Але, паводле **Ёпса**, беларускі праект далёка не завершаны. «Ён нават ва ўкраінцаў яшчэ не завершаны, а мы ад украінцаў адстаём на гадоў 50. Лукашэнка вам падаецца жахам, бо вы ня бачылі Сакалова, Панцеляймона Панамарэнку і губэрнатара Курлова».

Пратэстуе і **Алесь Юркавец**: «Даўно ўжо нідзе вёска ніякай ролі ў нацыябудаўніцтве не адыгрывае. У нас галоўная ейная роля была — у захаваньні мовы і традыцыйнай культуры ў неспрыяльнай сытуацыі, зь якой яна справілася. Тыя людзі, якія трымаюцца беларушчыны сёньня, — людзі збольшага гарадзкія. І будуць трымацца свайго незалежна ад далейшага лёсу вёскі. А пашырацца будзе база беларушчыны тады, калі людзі будуць бачыць: беларуская мова — гэта мова высокай культуры. Што тычыцца таго, якая культурная мадэль перамагла, то канчаткова гаварыць пакуль рана. Бо расейскамоўная масавая культура пашыраецца ў тым ліку праз яе навязваньне дзяржавай. У яе няма стымулу да паляпшэньня якасьці, а ў нас — ёсьць. Калі складзецца сытуацыя вольнай канкурэнцыі, мы, калі сёньня не апусьцім рукі, будзем да гэтага падрыхтаваныя, яны — Бог ведае».

**Палівач** не здаецца: «Якая б вёска ні была, але яна захоўвала натуральную мову і культуру. Цяпер вёскі няма. І горад мовы не пераняў. Мовай карыстаецца абмежаванае кола (на вялікі жаль, да гэтага кола належыць шмат неадэкватных людзей, для якіх мова проста спосаб выдзеліцца). Трэба рэальна глядзець на рэчы».

Цікава, што ў гэтыя ж дні **Някляеў** пэсымістычна заяўляе на старонках віленскае «Свабоды»: «Традыцыя падтрымліваць дзяржаўную беларушчыну зьнікла, сьвядомасьць іх [чыноўнікаў] абсалютна расейская, яны ўжо праз пакаленьне адарваныя ад зямлі і бацькоўскай вёскі. Яны вырасьлі ў горадзе, у якім няма аніякай культуры». Вясковыя комплексы ў нашае нацыі — надта жывучыя!

Аднак **Алесь Юркавец** упэўнены: «Масава горад яшчэ [мовы] не пераняў, але і сьмерці мовы пасьля зьнішчэньня беларускай вёскі не адбылося. Ведаю значную колькасьць беларускамоўных, якія чыстыя гараджане ці мелі зь вёскай мінімальныя сувязі. Што датычыць шырокага распаўсюджаньня мовы, то пакуль палітычныя ўмовы гэтаму не спрыяюць. Але ж так будзе не заўсёды, і пра гэта сьведчыць недалёкая гісторыя. Яшчэ ў пачатку 1991 г. мала хто бязь зьедлівай усьмешкі мог успрымаць словы, што хутка СССР разваліцца і Беларусь стане незалежнай. Але гэта адбылося. Так і з Лукашэнкавым рэжымам. І тады могуць адкрыцца новыя магчымасьці і для беларушчыны. Пасьпяхова іх рэалізаваць можна пры ўмове, што мы зараз створым неабходную аснову. Зь неба гэта ўсё ня зваліцца, гэта ствараецца карпатлівай, часам няўдзячнай працай, не за адзін дзень, год і нават дзесяцігодзьдзе. Беларусізацыя пачатку 1990-х г. фактычна грунтавалася на пяску, бо тагачасная беларуская культура была аж занадта зрошчаная зь вёскай (пры перавазе ўжо гарадзкога насельніцтва) і небеспадстаўна ўспрымалася вельмі многімі як аўтсайдэрская. За 15 гадоў усё зьмянілася, і цяпер белмова праточваецца ў тыя сфэры, дзе раней была манаполія расейшчыны (цяпер — гегемонія, але ўжо не манаполія). Ідзе працэс будаваньня трывалага падмурку нацыі».

**Палівач** лічыць зьняпраўджанай даўнейшую стратэгію **Сяргея Дубаўца** пра тры складнікі беларушчыны: «Мова, Вёска, Вільня». Ён заўважае: «Хочацца спытаць: ну, і дзе вёска? Дзе Вільня, якую літоўцы за дваццаць год пераварылі амаль цалкам. Дзе мова?» Яму адказаў **Саянаў**: «Дубавец таксама можа памыляцца. Вёска сапраўды сышла, Вільня — ня больш як сымбаль, але

мова жыве. Не паўнакроўным і не паўнавартасным яшчэ жыцьцём, але тым ня менш. Хоць у хаўтурныя званы білі яшчэ ў пачатку XX ст. Цяпер набывае сілу цяжкі і даволі павольны працэс крышталізацыі нацыянальнай эліты, які пачынаўся на працягу мінулага стагодзьдзя некалькі разоў і перапыняўся нялюдзкім гвалтам. Ня ўсё адразу».

## У дзяржаве ці па-за ёй?

Але эліта ня можа чакаць на дзяржаву. **Pan Brudas** наўпрост перасьцерагае: «Калі нечага няма — зрабі сам або дапамажы зрабіць таму, хто робіць. Хацелася б больш і хутчэй — зрабі. Інакш спадзяваньні застануцца толькі спадзяваньнямі».

Аднак **С.см.** цьвяроза адзначае: «Галоўнае пярэчаньне — што мы зможам разьвівацца без дапамогі дзяржавы. Цяпер сяк-так выходзяць кніжкі ды часопісы. Але, скажам, дашкольная ці школьная адукацыя (справа, па сутнасьці, якраз дзяржаўная) — дык там бяда. Безь дзяржаўнай падтрымкі нацыянальнага (найперш беларускамоўнага, але ня толькі) наўрад ці што атрымаецца. Хто як не дзяржава (ня маю на ўвазе лукашэнкаўскі калгас) мае падтрымаць сыстэмай грантаў — нацыянальнае кнігавыданьне, папулярызацыю белкультуры».

На думку **Алеся Юркаўца**, «дзяржаўная беларусізацыя будзе мець посьпех, калі будзе ісьці гаворка пра замену адной разьвітай мовы іншай, таксама разьвітай. І пакуль мы ня можам мець уплыву на дзяржаўную палітыку, трэба ўсебакова разьвіваць беларушчыну і прасоўваць яе ў розных сфэрах без дапамогі дзяржавы. Прыгадайце пачатак 1990-х, не ідэалізуючы таго часу. Шмат добрых ідэяў, а магчымасьцяў іх рэалізацыі — вобмаль. Напрыклад, было прапанавана вывучэньне замежнай літаратуры перанесьці ў курс беларускай літаратуры і выкладаць на белмове. А перакладаў на беларускую мову няма. Хуценька хтосьці пераклаў, на якасьць ня гледзячы — няма калі. А пасьпех — курам на сьмех. Можа каго прыцягнуць такая беларусізацыя? Можа, прыведзены выпадак і падасца драбніцай, але ён — тыповы, і ў іншых сфэрах гэта яшчэ больш адчувалася. Пакуль мы ня можам праводзіць беларусізацыю, трэба ўжо цяпер рыхтаваць пад яе ўсю неабходную базу, каб пасьля ня кідацца ў перапалоху і не завальваць напрамак за напрамкам».

У цэлым, Алесь згодны, што прагрэс ёсьць, нават без дзяржавы. «Галоўнае — беларускасьць разьвіваецца незалежна ад дзяржавы і любыя палітычныя зьмены паўплываюць на яе разьвіцьцё толькі станоўча. Горшай дзяржаўная палітыка наўрад ці можа быць, а да цяперашняй мы прыстасаваліся і ня толькі выжываем, але і пашыраемся. Калі наступная ўлада будзе нам хоць бы не замінаць, усё выбухне. Плыні пад лёдам не відно. Перад маімі вачамі прабегла шмат людзей, якія да беларушчыны гарнуліся, размаўлялі па-беларуску, а пасьля стамляліся і актыўнасьць зьмяншалі. Цяпер яны белмовай не карыстаюцца, але ж гэта ня значыць, што яе цалкам забылі. Прыйдзе час — і беларускамоўных стане болей. А да таго часу тым, хто сябе беларушчыне ахвяраваў, трэба напружана працаваць, каб рабіць яе сучаснай і прывабнай. У кожнага народу былі цяжкія часы, у якія больш залежала не ад народу, а ад эліты. Савецкіх часоў зь іх беларускамоўнымі праграмамі мне ані трохі не шкада. Менавіта ў тыя часы беларуская мова была выціснутая на пэрыфэрыю грамадзкага жыцьця. Толькі камуністы былі майстрамі па прыкрываньні фігавымі лісточкамі. Праз тое сёньня можна пачуць, як Машэрава, пры якім былі зачыненыя беларускія школы ў гарадах, прапануюць Лукашэнку як узор стаўленьня да нацыянальнай культуры».


«КРИТИКА»

## Малыя справы — вялікая будучыня

Калі немагчыма разьлічваць на рэсурсы дзяржавы, варта зьвярнуць увагу на велізарны патэнцыял малых праектаў. **Згодны з Гы** нагадвае, што нешматлікая «першая «Наша Ніва» стварыла перадумовы для дзяржаўнасьці беларусаў. Цяперашнія незалежныя СМІ стварылі базіс для ператварэньня Беларусі ў нацыянальную эўрапейскую дзяржаву. Гаворка пра таго, хто зьмяняе, а не пра таго, хто большы! Хрысьціянаў таксама было мала, але іх ідэі мелі калясальны патэнцыял. Так і цяперашнія незалежныя СМІ, гуманітарыі і творцы маюць калясальны патэнцыял для нацыятварэньня. Яны патэрны закладаюць. «ARCHE» мае малы наклад, але гэта фантастычна працаёмкі базіс пад мэтадалягічна сучасную беларускую гуманітарную навуку. Прыклад з Глёбусам мо ня самы ўдалы, але сутнасна правільны. Глёбус, Арлоў, Хадановіч і астатнія зьмянілі стратагему беллітаратуры — не вясковая, не крытычна-рэалістычная і не завязаная на каляніяльную адміністрацыю».

**Ігар Кузьмініч** падсумоўвае: «Мала людзей размаўляе на-беларус-

Працяг на старонцы 26.

# Голас нацыі

Працяг са старонкі 25.

ку. Але яны ёсьць. Мала выдаецца твораў па-беларуску, але яны выдаюцца, і самае галоўнае — яны запатрабаваныя. Трэба пашыраць беларускамоўнае атачэньне ў тых умовах, якія ў нас ёсьць сёньня, а ня ў тых, якія б мы хацелі мець. Дзяржаву і супольнасьць будуюць нават ня столькі на плошчах, але ў першую чаргу ў сьвядомасьці, у інстытуцыяналізацыі супольнасьці, у фармаваньні і пашырэньні каштоўнасьцяў. Спачатку трэба падрыхтаваць супольнасьць і сацыяльную базу для палітычных зьменаў, а потым праводзіць гэтыя зьмены. Калі спатрэбіцца, то і на плошчы».

## Кіты беларускага акіяну

Каб падрыхтаваць базу на зьмены, патрэбны сыстэматычны падыход, якога беларускім лідэрам часам бракуе. Замест таго яны аддаюць перавагу дарэфлексіўным, эмацыйным формам. Гэтым вызначаецца рэакцыя **Зянона Пазьняка**, які для крытыкі зачапіўся за маю абсалютна выпадковую падборку «кітоў» сёньняшняй белкультуры. Пазьняк напісаў: «Усё гэта можна ўспрыняць толькі як жарт, асабліва пра «кітоў». Гэта нейкі мазахізм, збочанасьць у мазгах. Беларуская культура трымаецца на Купалу, на Коласе, на Быкаве, на Багдановічы, на Барадуліне, Разанаве, Бураўкіне, Някляеве... Словам, вялікае трымаецца на вялікім, трывалае — на трывалым, нацыянальнае — на нацыянальным. Шчыра кажучы, мяне часам палохае гэтая багемнасьць, гэтая другаснасьць думаньня сярод чумы».

Мая падборка «кітоў» магла быць зусім іншай, але ішлося пра сёньняшнюю культуру і пра тое, каго рэальна згадваюць, цытуюць, пераймаюць у творах і жыцьці маладыя людзі. Я не жыву ў нейкім своеасаблівым адраджэнскім акварыюме дый браў для прыкладу звычайнае моладзевае асяродзьдзе, Volkskultur, а ня Hochkultur.

**С.см.** скептычна адцеміў: «Кітоў у нас ня выгадавалася. Не «НН» кіт — а саўбелка ды камсамолка-таўстушка, а Глёбуса пераплюне якая Наталья Батракова». **Гы**: «Саўбелка — гэта аніяк ня кіт, а празьмерна надзьмуты балёнік».

**С.см.** працягвае: «Кіты адыходзяць. Адамовіч, Адамчык, Быкаў, Брыль. Перад імі — Мележ, Караткевіч, Стральцоў. Такіх не прыйшло пакуль. А што стварылася новае пакаленьне творцаў — таксама ўсё адносна. Падышоў да паліцы — палова беларускіх кніг, што маю, выдадзена ў першай палове 90-х. У Барыса Пятровіча мара — павыдаваць тых, хто ў 90-х падаваў вялікія надзеі — і зьнік зь літаратурнага жыцьця. Спытайце ў Пятровіча — пару дзясяткаў назаве».

**Ляма** ня згодны: «Вольскі, Арлоў, Булгакаў, Сіліцкі, Мілінкевіч, Хадановіч — ніяк ня меншыя кіты, чым Стральцоў, Пазьняк, Адамчык, Мележ. Сіла новага пакаленьня — што яны, у адрозьненьне ад Адамчыка ці Мележа, зусім не ідуць на кампрамісы і вельмі адкрытыя сьвету».

## Пакаленьне амонаўцаў і маладафронтаўцаў

**Сяргей Харэўскі** наважыўся ацаніць мой тэкст як своеасаблівы маніфэст новага пакаленьня: «Тое пакаленьне беларусаў, для якога незалежнасьць РБ — гэта ўся іх сьвядомая біяграфія, якое ўвайшло ў самастойнае жыцьцё за гэтым рэжымам, мае сваю візію падзеяў і глядзіць на сваю будучыню ў *нашай* краіне аптымістычна і патрабуе права голасу ў незалежным грамадзтве».

**Палівач** парыруе: «А ў лукамоле якое пакаленьне, спадар Харэўскі?» На гэта рэагуе **Чавілап**: «А ў «Маладым фронце» якое пакаленьне?».

Я таксама не адказваю за сваё пакаленьне. Але ўсё часьцей ганаруся ім. У ім ёсьць і АМАПаўцы, і Зьмітры Дашкевічы, але сьвядомы супраціў вышэйшы і мацнейшы за аўтаматычнае выкананьне загадаў. Ён — застанецца.

* * *

У беларускай супольнасьці, як у любой нармалёвай, пануе плюралізм думак. Пакуль ён вірue ў рамках альтэрнатыўнага грамадзтва, але, дасьць Бог, неўзабаве выплюхнецца на шырэйшыя прасторы, туды, дзе ён мусіць быць — у органы дзяржаўнай улады і мас-мэдыі. Гэта ўмова нармалізацыі нашага жыцьця. Мала радасьці быць сытым, але прыгнечаным маральна і духова. «Для чалавека пачціввага няма нічога даражэйшага за вольнасьць».

*Маладэчна*

# «Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў» — 2




Другое выданьне супэрпапулярнай кнігі Андрэя Катлярчука, беларускага гісторыка, што жыве ў Швэцыі. Кніга дапрацаваная і патаўсьцела на трыццаць старонак.

**Катлярчук А. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў.** — Вільня: «Інстытут беларусістыкі», 2007.

пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

## Беларускія цягнікі павялічаць хуткасьць да 160 км/г

Цягнікі на чыгунцы Берасьце-Масква ў бліжэйшым часе будуць рухацца з хуткасьцю 140 км/г. Пра гэта паведаміў кіраўнік Беларускай чыгункі Ўладзімер Жарэла. Зь ягоных словаў, на шматлікіх перагонах, асабліва між Берасьцем і Баранавічамі, магчымая хуткасьць і да 160 км/г. Дзеля гэтага цяпер праходзяць абкатку спэцыяльныя электравозы падвойнага току.

**Паводле БЕЛТА**

## Раскапаныя курганы часоў Рагнеды

Невядомы пашкодзіў пяць курганоў X—XI ст. на тэрыторыі гісторыка-культурнага запаведніку «Заслаўе». Ідзе сьледзтва. У дачыненьні да ня знойдзенага пакуль злачынцы пачатая справа па ч.1 арт.344 Крымінальнага кодэксу.

## Уся «аська» — за бел-чырвона-белы сьцяг

У інтэрнэце прайшло галасаваньне за скасаваньне чырвона-зялёнага сьцягу ў мэню пошуку беларускіх карыстальнікаў камунікацыйнай праграмы ICQ. Абсалютная большасьць (97%) выказалася за зьмены. Але мэнэджмэнт ICQ пакуль не адгукнуўся. Ініцыятары акцыі зьбіраюцца пісаць лісты кіраўніцтву «аські».

## Чэхія адпомсьціла за скандалы

Натуральна, гэта жарт. Спорт і палітыка не павінныя судакранацца. Зборная Беларусі пачала чэмпіянат сьвету па хакеі буйной паразай. 27 красавіка яна была бітая чэхамі зь лікам 2:8. Адзіны пазытыў гульні — мноства бел-чырвона-белых сьцягоў на трыбунах. У пятніцу ў нашай групе амэрыканцы перамаглі Аўстрыю. Амэрыканцы перамаглі 6:2. У нядзелю беларусы прайгралі амэрыканцам, а чэхі пабілі аўстрыйцаў. І толькі ў аўторак да беларусаў прыйшоў першы посьпех. Яны хораша перамаглі аўстрыйцаў 5:2. Гэта дазволіла ім захаваць тэарэтычныя шанцы на мэдалі.

## Кантрабандыст вёз у Беларусь Леніна

Грамадзянін Беларусі спрабаваў вывезьці з Украіны культурныя каштоўнасьці. Згорнутыя ў рольку карціны выявілі чарнігаўскія мытнікі на трэцяй паліцы купэ за скрынкаю з вагонным інвэртаром у цягніку «Кіеў — Менск». Пад тапчаном выявілі вырабы з парцаляны, якія іх гаспадар ніяк не плянаваў прад’яўляць мытнікам.

Сацрэалістычныя «Прыём у піянэры», «Ленін — студэнт» і «Вясельле» напісаныя ў XX ст. і маюць гісторыка-культурную каштоўнасьць. З 14 статуэтак адна прызнаная дарэвалюцыйным вырабам.

Затрыманыя каштоўнасьці да суду захоўваюцца на чарнігаўскай мытні.

## Закінуў нерат — сеў за краты

Ноччу 27 красавіка супрацоўнікі праваахоўных і прыродаахоўных органаў затрымалі на Заслаўскім вадасховішчы ля Ждановічаў двух жыхароў Менску. Тыя «ў забаронены час, з выкарыстаньнем сетак, незаконна здабылі 97 кг рыбы, прычыніўшы ўрон навакольнаму асяродзьдзю на 15 млн. 531 тыс. руб. У іх канфіскавана 713 асобінаў рыбы азёрна-рачных парод, гумовы човен і прыстасаваньні для незаконнай рыбнай лоўлі». Распачатая крымінальная справа па ч. 3 арт. 281 (незаконная здабыча рыбы або водных жывёл) КК. Затрыманыя зьмешчаныя ў ізалятар часовага ўтрыманьня. Крыху раней падобная справа ўжо была распачатая супраць менчука, які здабываў ракаў.

## У львоўскіх гатэлях забраніраваныя ўсе месцы на Эўра-2012

Бронь пашыраецца нават на гатэлі, што будуюцца, і гатэлі, якія існуюць у праекце.

## Адкрыта плянэта, падобная да Зямлі

Плянэта 581 с крыху большая за Зямлю і на ёй могуць быць тэмпэратуры, прыдатныя для існаваньня вады ў вадкім стане. Плянэта і яе зорка Gliese 581 сузор’я Вагаў знаходзяцца за 20,5 сьветлавых гадоў ад Зямлі. 581 с у пяць разоў цяжэйшая за Зямлю. «Год» там цягнецца 13 зямных дзён. Гравітацыя ў 1,6 разу большая за зямную. Тэмпэратура на паверхні можа вагацца ад 0 да 40 °C. А значыць, там магчымае жыцьцё зямнога тыпу.

**ЗП, СХ, ВД**

## КАЛІ Б...




МАЛЮНКІ І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

**...забарона рыэлтарам выкарыстоўваць у рэкляме продажу жыльля словаў «элітны», «прэстыжны» стала тэндэнцыяй.**



**...партызанскі парад перамогі 1944-га быў арганізаваны паводле заканадаўчых нормаў Рэспублікі Беларусь.**

— Прабачце, гер гаўляйтар, я ад ініцыятараў параду перамогі. Хацелі б, згодна з законам, падаць за два тыдні заяву наконт правядзеньня ў Менску маршу вызваленьня ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў...

## ГАННА АЎЧЫНЬНІКАВА

***

Пад флейту ветранага раньня
Сьпявае рэквіем трысьцё.
Пілі мы ўчора за каханьне,
А сёньня п'ем за забыцьцё.
Для песень ветранага ранку
Любоў, зьнявага – ўсё адно.
Зеленавокая каханка
З атрутай зьмешвае віно.
Трысьцё схіляецца да долу,
Паветрам поўніцца прасьцяг...
Паволі абыходзіць кола
Гаркота ў келіху жыцьця.

*Горадня*

## СЯРГЕЙ ПРЫЛУЦКІ

БУДЗЕНЬ ПАЭТА

паэт прачынаецца аб 11.20
правіць пару радкоў
ва ўчорашнім вершы пра красу сьвету
выпівае гарбаты выпальвае дзьве цыгарэты
пасьля чытае Кляўса Мана ў сарціры

а 12.40 выбіраецца ў краму
але ў парку засраным лябрадорамі і пэкінэсамі
сустракае некалькі сучых сыноў
як звычайна просяць нечага
атрымліваюць па зубох
паэт таксама зарабляе па яйках

вярнуўшыся ў пакой
з хлебам макаронаю і пабітымі яйкамі
перакрэсьлівае пару радкоў
ва ўчорашнім вершы пра красу сьвету —
дзень выдаўся надзвычай паэтычны
увечары трэба будзе пачаць новы верш
пра гэтую клятую красу сьвету

*Берасьце*

## ВІТАЛЬ РЫЖКОЎ

РОСПАЧ НА ПРОДАЖ

Высьпела роспач, пачвара чароўная, —
поўныя вочы празрыстае слодычы.
Высьпела роспач — ладная, чорная —
і хопіць на продаж роспачы.

*Высьпела роспач,*
*вы–ы–ысьпела,*
*вылезла,*
*воспай на твары высыпала,*
*воскам, выступамі,*
*сьлязамі празрыстымі,*
*выспамі,*
*высямі,*
*няспыннымі выразамі,*
*выспалася…*
*Высьпела.*

Высьпела роспач. На першым паверсе,
дзе вершы складае нейкая сволач,
пахне гарэлкай. Па адной з вэрсій,
гэта —
высьпела роспач.

Высьпела роспач.
У краіне адчаю,
пераважна населенай беларусамі,
чалавек з вусамі шлёпае вуснамі
і слова яго —
не да–па–ма–гае…

*Высьпела роспач,*
*высьпела,*
*зьзяючай язвай на целе выступіла,*
*рапсодыяй высахлай,*
*срэбраным выстралам,*
*вызнала,*
*вылезла,*
*задзірліва чорныя кветкі выставіла,*
*выкараскалася —*
*высьпела…*

Высьпела роспач, вые нямая,
і проста так да яе не падыдзеш,
ды скажыце ўсім: чалавек, што складае,
мае танную роспач на продаж.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Агнявое шоў на менскай вуліцы.**

# Тайга




**Аляксей Шадзько і група «Сястра», West Records, 2007.**

Шадзько ці не адзіны з актораў, хто выказаўся ў падтрымку Паўла Харланчука, звольненага з Расейскага тэатру пасьля арышту на Плошчы ў сакавіку 2006 г.

Чарговая порцыя ўзорнага «расейскага року» ад вядучага актора Расейскага тэатру Аляксея Шадзька. Яго дзясяты дыск нічым ня зьдзівіць тых, каго кранала калісь «Мая Маруся». Аранжыроўкі Шадзька простыя, але густоўныя, тэксты — немудрагелістыя, але далёкія ад блатняку. Шадзько вызначаецца незалежнасьцю як у музычнай, так і ў тэатральнай тусоўцы. Ён ці не адзіны з актораў, хто выказаўся ў падтрымку Паўла Харланчука, звольненага з Расейскага тэатру пасьля арышту на Плошчы ў сакавіку 2006 г. Але пры тым Шадзько не бярэ ўдзелу ў палітычных акцыях і ня піша тэкстаў на патрэбу дня. Музыка для яго ня сродак выжываньня, а так — для душы. І ён не халтурыць. Таму зь ім гралі выключныя прафэсіяналы — Аркадзь Юшын, Кірыла Шавандо, Піт Паўлаў, «Apple Tea» ў поўным складзе... Таму ён зьбірае поўную залю раз на месяц. Шадзько — гэта «Крама» для тых, хто не надае моўнаму чыньніку ў музыцы вялікага сэнсу. Гэта музыка не для ўсіх. Праўда, гэтыя абраныя жывуць у крыху іншай культурнай прасторы, чым прыхільнікі «Крамы» ці то Вайцюшкевіча. Але яны аднолькава зь імі ня любяць дурной няякаснай музыкі. Найлепш Шадзька ў новым альбоме прадстаўляюць тры песьні — загалоўная «Тайга» — моцны рокавы нумар зь фірмовым надрыўным вакалам; блюз-рокавы нумар «Сястра» з выдатнай гітарай Сяргея Анцішына ды кранальная «Леташні люты», дзе на першы плян выходзіць пан-флейта. З усёй праграмы выбіваецца хіба трэк «Белая птушка, не прылятай» зь няўцямным ухілам у гард-рок і дэпрэсіўным тэкстам пра «сьмерць бледнамордую».

# Metallection-4




**Праект Hard Life — Heavy Music, БМА-груп, 2007.**

Гурт «Наша Вайна» напісаў мэтал-«Гімн Беларусам».

Сьвята на вуліцы беларускіх экстрэмалаў. Мэтал для Беларусі — болей чым музычная плынь. Гэта жыцьцёвая філязофія пакаленьня, што натхнялася пры канцы 90-х посьпехам гамельчукоў з Gods Tower (яны калісь трапілі ў сусьветны top-5 цяжкай музыкі). І цяпер на кожнага беларускага папсавіка прыпадае два-тры мэталісты. На гэты дыск ня трапіў шмат хто зь вядучых гуртоў кірунку, такіх, як «ТТ-34» і Rasta (па-беларуску не пяюць прынцыпова), але прахадных нумароў тут практычна няма. Трэкі адбіралі 14 экспэртаў, сярод якіх былі Пятро Ялфімаў, Лявон Вольскі і той самы Лэсьлі «Ножык» з Gods Tower. Уразьлівых гітоў мэталісты ня пішуць, але ёсьцека вельмі прыстойныя песьні, якія прыемна слухаць з прычыны іх якаснага запісу і слушнага вакалу (Divina Enema і Soulsides). Не расчаравалі ляўрэаты «Басовішча» розных гадоў — «Сонцаварот», «Зьмяя» ды Imprudence. Цешыць, што мэталісты не хапаюцца за фальклёр як за выратавальную саломіну, а пішуць тэксты самі. Разам з паганскай лірыкай, знаходзім экзыстэнцыйныя матывы («Зьнікні ці памры» ад Inner Resistance) і вострасацыяльнасьць. «Зьмяя» пяе: «О, людзі — вы богі ў сваім брудзе, увязьлі ў сваім жа дзярме па грудзі!», а гурт «Наша Вайна» напісаў мэтал-«Гімн Беларусам». Для тых, хто цэніць Сваё.

# Bum-bum




Da Vinci, Vigma, 2007.

Беларус, што сьпявае па-італьянску, прыцягне ўвагу аўтаматам — гэта вам ня «Чарку на пасашок» гарлаць!

Дэбютнік ад італьянскамоўнага праекту вядучага каналу «Лад» Дзяніса Дудзінскага і папсовага кампазытара Лявона Шырына. Даліся ім у знакі, відаць, падлеткавыя ўражаньні ад фільмаў з Мастраяні і песень Чэлентаны. На дыску нават песьня такая ёсьць — «Come Celentano». Спробу зрабіць узорную італьянскую папсу сваімі сіламі можна лічыць удалай з тэхнічнага боку — творы аранжаваныя ды запісаныя досыць смачна для беларускай студыі. Але слухаць дыск сумнавата. І ня толькі таму, што ўсе музычныя хады прадказальныя. Адчуваецца ва ўсіх гэтых «бумбумах» ды «чаобамбінах» штучная весялосьць, зусім не «крамбамбульная». Сьпяваючы па-італьянску, хлопцы не прыносяць нічога ні ў беларускую поп-музыку, ні ў італьянскую. Іх разьлік зразумелы: беларус, што сьпявае па-італьянску, прыцягне ўвагу аўтаматам — гэта вам ня «Чарку на пасашок» гарлаць! Цікавасьць тая задавальняецца ўмомант, і болей за выказваньне «І нашы могуць ня горш за Чэлентану» яны наўрад нешта атрымаюць. Паразытаваньне на музычных стэрэатыпах наўрад ці паспрыяе доўгатрываласьці праекту. Для тых, хто сумуе па перадачы «Мэлёдыі і рытмы замежнай эстрады».

**Сяргей Будкін**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

**Канцэрт хрысьціянскай музыкі**

**11 траўня а 19-й у канцэртнай залі Чырвонага касьцёлу** (пл.Незалежнасьці) — канцэрт беларускай хрысьціянскай музыкі. У праграме: хрысьціянскія паэты; барды Андрэй Мельнікаў, Алеся Ўнукоўская. Уваход вольны.

# «Палац» стаіць трывала

«Палац»: першы легальны выступ за тры гады. Піша **Сяргей Будкін**.

Гарадзенскі канцэрт «Палацу» — знакавы ў гісторыі калектыву адразу з трох нагодаў. Першая: пачынальнікі фольк-мадэрну ў Беларусі выступалі легальна першы раз пасьля ўдзелу ў мітынгу ў 2004 г. Другая: гралі сольны канцэрт упершыню за сваю гісторыю. Але галоўная нагода — 15-годзьдзе гурту. Публіка відавочна затужыла па Хаменку ды кампаніі — квіткоў не было за тыдзень.

«Грошы невялікія, але ж даўно ня гралі канцэрту па квітках», — разважае дарогай у Горадню Алег Хаменка, які ў апошнія гады займаецца больш радыйнымі справамі, чым музыкай. Аднак, пры канцы красавіка, гурт аднавіў кіпучую канцэртную дзейнасьць. Толькі што вярнуліся з Украіны — гралі на запрашэньне адміністрацыі Данецкай вобласьці ў тамтэйшай філярмоніі. І вось, не пасьпеўшы як сьлед адпачыць, музыкі кіруюць у Горадню.


**Алег Хаменка.**

Калісь «Палац» меў усё, пра што можа марыць беларускі музыка: замежныя туры, дзяржаўную падтрымку, прыстойную кропку ды студыю, тэле- і радыёратацыі. Не адзін год яны выдатна спалучалі выступы на «Басовішчы» і «Славянскім базары», мелі павагу як з боку эстрадных мэтраў, так і любоў незалежнікаў. «Мусілі рабіць выбар у пэўны час. І я не шкадую пра сваё рашэньне», — так Хаменка згадвае той выступ на мітынгу, пасьля якога ўсе выступоўцы займелі праблемы з чыноўнікамі. У «Палаца» засталася хіба толькі павага ды любоў. Але ў цяжкі час гурт не разьбегся, працаваў з новым матэрыялам, не пакінуў ідэі стварэньня м'юзыклу. І з радасьцю адгукнуўся на прапанову даць канцэрт у Горадні.

Жыцьцё ў Горадні віруе. На Савецкай купка маладзёнаў абмяркоўвае чарговую акцыю пратэсту супраць руйнаваньня гістарычнага цэнтру. Туды-сюды сноўдаюць байкеры, у гэты дзень акурат праходзіць іх зьлёт. Нейкая дэлегацыя кіруе ў бок мясцовай філярмоніі — там у гэты вечар сьвяткуюць яе 60-годзьдзе. Да Тэатру лялек, дзе грае «Палац», не пад'ехаць — паўсюль людзі, вясельле за вясельлем, кілямэтровая чарга па піва. Даішнікі забясьпечваюць машынам гурту «зялёны» калідор, прыязная сустрэча з арганізатарамі: «А мы яшчэ дзьве гадзіны таму вам пад'есьці зрабілі». Пляніроўкай тэатар нагадвае купалаўскі, але ж гарадзенскі збудаваны значна раней — у 1762 г. Тут добрая акустыка, і нават кепскі апарат ня здолеў папсаваць сьвята.

«Палацаўцы» збудавалі выступ такім чынам, што на кожны год дзейнасьці прыпадала свая гісторыя ды песьня. Хаменка згадваў пра першыя гастролі і першыя прыгоды, казаў пра тое, як зьявілася ў рэпэртуары тая ці іншая песьня. Асаблівую весялосьць у залі выклікала гісторыя пра твор «Волы»: «За тымі часамі мужыкі штогод выпраўляліся па соль у Крым. Шлях няблізкі, дык што рабіць здаровым мужыкам, на возе седзячы? Якраз і мы пачалі выпраўляцца ў замежныя гастролі, таму надта блізкім аказаўся гэты сьпеў», — апавядае сьпявак пад агульны рогат залі. Цікава, што гарадзенская публіка не падпявала нават на «Новай канюшні», але слухала зь вялікай прыязнасьцю. За ўвесь канцэрт хіба толькі купка чыноўнікаў пайшла з залі. Упэўніліся, відаць, што «Палац» напраўду апалітычны ў сваёй творчасьці. Залю асабліва кранула «Праваджала маці сына», якую Хаменка напісаў па матывах аднаго знойдзенага радка зь песьні, што сьпявалі паўстанцы Каліноўскага: «Самой песьні так і не знайшоў, давялося ўявіць, якой яна магла быць, і напісаць яе самому», — тлумачыць са сцэны Хаменка.

Дарогай дамоў «палацаўцы» шкадавалі пра адзінае: што ня здолелі сабраць разам на 15-годзьдзе тых, хто быў зьвязаны з гуртом раней. З «Палацу» выйшла нямала знаных музыкаў. «Палацаўцы» гралі і ў «Песьнярах» зь «Сябрамі», і ў «Ляпісе Трубяцкім» з «Крамай». З «Палацу» выйшлі паўнавартасныя музычныя праекты — «Крыві» ды «Юр'я». Вераніка Круглова жыве цяпер у Бэрліне, Юрась Белякоў зарабляе на жыцьцё ў Амэрыцы, Юры Выдронак ды Зьміцер Вайцюшкевіч шчыльна занятыя сваімі праектамі. Але ўсе, хто чуў «Палац», ведаюць — гэта музыка будзе вечнай!



# Ружанскія ружы

**У нядзелю, 29 красавіка, у менскай кавярні «Добрыя Мысьлі» (вул.Магілёўская, 12/1), адкрылася выстава майстра выцінанкі, мастака й фатографа з Ружанаў Юр'я Малышэўскага.**

Юры Малышэўскі нарадзіўся ў Сібіры, у сям'і вайскоўца, у 1956-м. На шчасьце, у раньнім дзяцінстве патрапіў на радзіму бацькі, у прыгожае мястэчка Ружаны на Берасьцейшчыне, былую рэзыдэнцыю князёў Сапегаў, дзе й жыве па сёньняшні дзень.

У 1960-я я вёў гурток маляваньня ў Ружанскім Доме піянэраў. Тады й пазнаёміўся зь Юрам. Юра скончыў ружанскую дзесяцігодку, адслужыў у войску і ўвесь час маляваў, дасканалячы тэхніку, займаўся жывапісам, разьбою, скульптураю. На пачатку 1970-х пасябраваў з пробашчам ружанскага касьцёлу Сьв.Тройцы Міхалам Варанецкім. А М.Варанецкі ды яшчэ Вячаслаў Дубінка на той час былі адзінымі майстрамі ў Беларусі, якія займаліся адраджэньнем мастацтва выцінанкі. Ю.Малышэўскі стаў наступным.

Яго творы ахвотна купляюць госьці Ружанаў. Адбыліся й пэрсанальныя выставы: у Пружанах, Кобрыні, Пінску і Берасьці. Юры мае цэлую калекцыю дыплёмаў і граматаў.

Што ж спрыяе яго творчым посьпехам, акрамя прыродных здольнасьцяў і нястомнае працавітасьці? Безумоўна, ружанскае асяродзьдзе.

Сёньня Юр'ю Малышэўскаму за пяцьдзясят. Ён сябар Беларускага саюзу народных майстроў, бацька дарослых дзяцей. Ужо пятнаццаць гадоў кіруе дзіцячай студыяй народнае творчасьці, займаецца рэстаўрацыяй інтэр'ераў навакольных касьцёлаў і цэркваў, любіць Ружаны, зьбірае й захоўвае ўсё, што зь імі зьвязана.

І выцінае з паперы карункі з ружаў, яблокаў, дрэваў, вежаў, краявідаў Ружанаў.

**Уладзімер Крукоўскі**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Ідэальны незнаёмы

**Ідэальны незнаёмы** (Perfect Stranger)

ЗША, 2007, каляровы, 109 хв.

**Рэжысэр:** Джэймз Фоўлі

**Ролі выконваюць:** Холі Бэры, Брус Ўіліс, Джавані Рыбізі, Рычард Партноў, Гэры Дурдэн, Фларэнсія Лазана, Нікі Эйкакс

**Жанр:** Трымценьнік

**Адзнака:** 5 (з 10)

Амбітная журналістка Равэна (Холі Бэры) расьсьледуе сьмерць сваёй сяброўкі. Тая пазнаёмілася ў сеціве з рэклямным магнатам (Брус Ўіліс) і шантажавала яго пасьля любоўнае сувязі. Равэна абірае псэўданім, паступае на працу да рэкляміста — і заглыбляецца ў небясьпечны сьвет online-каханьня...

Акторы, запрошаныя на карціну, ня столькі раскрываюць вобразы, колькі прэзэнтуюць тавары й знакі. Шыкоўныя касьцюмы, інтэр'еры, гладкая скура, сэксапільная бялізна, фірмовая ўсьмешка Бруса Ўіліса, на якую пайшоў увесь ганарар карціны. Халаднаваты кіч не раздражняе, ён стрыманы і ў дакладных прапорцыях: чырвоная сукенка, зьнявечанае цела, дарагое віно, нож у сэрцы. Прафэсійная павярхоўнасьць, за якой толькі фэміністкі разгадаюць бездані (і разарвуць рэжысэра на шматкі).

Фільм не пакідае пачуцьця безнадзейна змарнаванага часу, але глядзець яго можна й не ў кінатэатры. Дый ня будзе вялікаю стратаю, калі яго, увогуле, не глядзець.

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТАР

### «Дзед і жораў» у Тэатры лялек

Нарэшце **ў Тэатры лялек** беларускамоўная пастаноўка (не было з паўгоду). Цуд адбудзецца **4 траўня аб 11 і а 14 гадзіне**. Цана квіткоў 1.500 — 2.500 руб. «Дзед і жораў» паводле А.Вольскага. Далучайцеся!

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

### Прэзэнтацыя кнігі Адзінца

**3 траўня на Ўправе БНФ** (вул. Варвашэні, 8) пройдзе прэзэнтацыя кнігі Аляксандра Адзінца «Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў». Удзел бяруць Аляксандар Адзінец, гісторык Алег Гардзіенка, пісьменьнікі Вольга Іпатава і Эдуард Акулін. Кнігу складаюць эксклюзіўныя ўспаміны 73-х прадстаўнікоў дыяспары ў розных краінах сьвету. У біяграфічных аповедах адлюстраваныя падзеі Другой усясьветнай вайны, эміграцыя, беларускае жыцьцё на чужыне. **Пачатак а 18.00.**

**Пагоня**

ЗА БЕЛАРУСЬ

# Дакажы, што не Іюнь

Прадпрымальніку з Чэрвеня ў Менгарвыканкаме загадалі дакумэнтальна засьведчыць, што па-расейску яго горад завецца не «Июнь».

26 сакавіка спадар Павал прынёс ва Ўпраўленьне рэгістрацыі і ліцэнзаваньня Менгарвыканкаму (каб. 104) дакумэнты для рэгістрацыі прадпрыемства. Іх праверылі, прэтэнзіяў яны ня выклікалі. Але праз тры тыдні прадпрымальніка ізноў выклікалі і прапанавалі выправіць у Статуце прадпрыемства, складзеным па-расейску, фразы «Минская обл., г. Червень» і «Червеньским РОВД Минской области» на «Минская обл., г. Июнь, и Июньским РОВД Минской области». Маўляў, «чэрвень» у перакладзе на расейскую мову — «июнь». Чалавек пачаў даводзіць, што горад Чэрвень — і па-расейску «Червень». Тады ад яго запатрабавалі афіцыйны ліст з Чэрвеньскага РУУС аб тым, што горад і раён называюцца па-расейску менавіта «Червень» і «Червеньский». «Чаму праз няведаньне супрацоўнікамі аддзелу рэгістрацыі геаграфіі Беларусі я павінен даводзіць, «што не вярблюд», і губляць каштоўны час, які, між іншым, — грошы?! — абураецца сп.Павал.

Цалкам яго ліст ёсьць на інтэрнэт-сайце Менгарвыканкаму ў гасьцёўні. Адказу чыноўнікі пакуль не далі.

**Сямён Печанко**

## Дыскаграфія

Hard Life — Heavy Music, Da Vinci, Аляксей Шадзько і група «Сястра». **Старонка 29.**




Пад флейту ветранага раньня
Сьпявае рэквіем трысьцё.
Пілі мы ўчора за каханьне,
А сёньня п’ем за забыцьцё...



**«Год паэзіі» — штотыднёвая старонка паэзіі ў год 125-годзьдзя нацыянальных паэтаў. Старонка 30.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Вользе Ц. зь Ліды.** Вершы ня ніўскія.

**Раману Л. зь Менску.** Вашы эцюды жанрава не газэтныя, таму іх ня будзем публікаваць. Хоць яны добра выпісаныя і выразна адлюстроўваюць Ваша напружанае духоўнае жыцьцё. Памятайце, што найбольшы попыт маюць творы (працы) у цьвёрда акрэсьленых жанрах. Скажам, на сёньня відавочна запатрабаванымі былі б п’есы (бо дзейнічае «Свабодны тэатар»), сцэнары (бо рыхтуецца ТВ «БелСАТ»), навуковыя працы. Зь іншага боку, толькі багаты жыцьцёвы досьвед і глыбокая адукацыя дазваляюць пісаць вялікія і значныя рэчы.




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў падарожжа 6 траўня (нядзеля) па маршруце: Менск—Глыбокае—Удзела—Мосар—Слабодка—Браслаў—Опса—Відзы—Друя—Менск. 18—21 траўня: Торунь—Хелмна—Голюб—Добжынь. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 509-12-16, 110-19-28

### РЭПРЭСАВАНЫЯ НАСТАЎНІКІ

**Падрыхтаваны** энцыкляпэдычны даведнік «Рэпрэсаваныя настаўнікі». Калі вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753-82-12, 755-25-61, (017) 211-09-53. Леанід Маракоў

### КНІГІ, МУЗЫКА

**DJ Адраджэньня** праводзяць нацыянальную віктарыну «Шоў Беларушчыны» ў менскіх школах і ВНУ. Замаўляйце! Т.: 694-82-80

**Абмен** культуралягічнай інфармацыяй, кнігамі. Дашлю сьпіс прапаноў. Канфэрэнцыі, літаратурныя вечарыны, выдавецкія праекты. Ад Вас – капэрта са зваротным адрасам. а/с 195, 220030, Менск. alesknigi@mail.ru

**Прапаную кнігі**: Краўцэвіч «Тэўтонскі ордэн», Ластоўскі «Кароткая гісторыя Беларусі», «Энцыкляпэдыя Гісторыі Беларусі» т.1, 2, 5, «Беларускі кнігазбор»: Каліноўскі, Аляхновіч, Баршчэўскі, Гётэ, Філяматы і філярэты, «Наша Ніва» 1906 – 1908 г ды іншае, багаты выбар. Т.: 753-70-05

**Маю відэазапісы** рыцарскіх фэстаў – Ліда, Ваўкавыск, Горадня, раскопкі палаца Радзівілаў, інш. Літаратуру па мэдыявістыцы, камплект значкаў «Гарады» Беларусі. Т.: 753-91-96

**Беларуская музыка і софт**, кнігарня «Наша Ніва» ды іншая нашая літаратура на Янкі Купалы, 27, павільён В, (+37529)7575867 (Алесь Мазанік)

**Цалкам шматгадовы** камплект «Крыніца», «Спадчына» «Гістарычная мінуўшчына», «ARCHE», асобныя нумары малавядомых выданьняў. Т.: 753-91-96

**Беларуская музыка** ды фільмы (DVD, CD), кнігі, слоўнікі, энцыкляпэдыі, газэты; значкі на Румянцава, 13 (ТБМ) ад панядзелка да пятніцы (15.00 — 19.30). Т.: 8-029-707-40-01.

### ВІТАНЬНІ

**Зьміцер Хведарук**! Ты — лідэр ад Бога. Трымайся веры! Ісаі 60:2. Алег Корбан! Госпад цябе любіць і беражэ. 1 Яна 4:4. Брат

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Гайна, Барысаўскага вуезду.** На Юр’я, увечар, у нашу цэркву залез злодзей, забраў там 38 з палавінаю рублёў і шукаў болей. Гэтым часам ішлі зь вечарніцаў хлопцы і, угледзеўшы ў цэркве агонь, паклікалі папа і стоража, каторы быў моцна напіўшыся. Злодзей стаў спускацца па вяроўцы з званіцы. Поп закрычаў, каб у яго стралялі; злодзей, спалохаўшыся, зваліўся. Тагды сталі яго біць і саўсім скалечылі, перабіўшы сьпіну і вывернуўшы нагу.

**Я.Гаравік «НН». №17. 1907**

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 02.05.2007.
Замова № 2391.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.